

ПА ТОНКІМ ЛЁДЗЕ

3

СТАБІЛЬНАЯ КРАІНА — КАРЫСНА ДЛЯ ЎСІХ



Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

18 СНЕЖНЯ 2020 г.
ПЯТНІЦА
№ 247 (29361)

+TV ПРАГРАМА

МЯСЦОВАЕ САМАКІРАВАННЕ

## ЦЫТАТА ДНЯ



**Міністр эканомікі Аляксандр ЧАРВЯКОЎ:**

*«Сёння за кошт прыватнага бізнесу фарміруецца практычна 47 % экспарту, 50 % ВУП, 60 % выручкі. Таму дзяржава робіць упор на развіццё бізнесу. У праекце Праграмы сацыяльна-эканамічнага развіцця Беларусі на 2021—2025 гады прадугледжаны меры, якія дазволяць не толькі стварыць спрыяльныя ўмовы, але і аказаць фінансавую падтрымку прадпрымальнікам. Асаблівая ўвага будзе нададзена маламу бізнесу».*

# ПЕРАДСВЯТОЧНЫ НАСТРОЙ





Сёння ў сталіцы пачынаюцца традыцыйныя калядныя кірмашы. Найбуйнейшы з іх разгарнуўся на плошчы каля Палаца спорту — сапраўдны міні-гарадок. А ўчора мне давялося паглядзець, як ідзе ўстаноўка і афармленне гандлёвых палатак і дамкоў, у якіх будуць гатаваць калядныя прысмакі, прадаваць сувеніры і тавары для ўпрыгажэння навагодняй ёлкі, неўзабаве пачнуць працаваць майстры і рамеснікі. Сярод удзельнікаў кірмашу — вядомы мінскі калекцыянер, мастак і бард Сяргей Шыла са сваімі велічнымі самаварамі, у якіх ён прыгатуе чай па ўласным рэцэпце. Кірмаш здзівіць і смажанымі каштанамі. Гэты калядны ласунак падрыхтаваў прыватны прадпрымальнік Аляксандр Рудзік. Маляўнічы гандаль на праспекце Пераможцаў будзе дзейнічаць да 14 студзеня наступнага года.

**Анатоль КЛЯШЧУК, фота аўтара.**

## КОРАТКА

● **У некаторых рэгіёнах Беларусі бальніцы аднаўляюць звычайны рэжым працы.**

● Адзіны інфармацыйна-адукацыйны рэсурс для ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі запусцяць у тэставым рэжыме з 1 студзеня 2021 года.

● **Амаль 79 % выдаткаў бюджэту ФСАН у 2021 годзе плануецца накіраваць на пенсійнае забеспячэнне.**

● Міністэрства аховы здароўя рэкамендуе адмовіцца ад навагодніх карпаратываў.

● **Самымі запатрабаванымі спецыяльнасцямі ў наймальнікаў Віцебска сёлета былі швачкі, зборшчыкі абутку, кіроўцы, медсёстры, прадаўцы.**

● Музычны спектакль для дзяцей «Навагоднія прыгоды ў Віртулянды» прадставіць Рэспубліканскі тэатр беларускай драматургіі.

● **У навукоўцаў атрымалася аднавіць рэчышча ракі Саломенкі ў Белавежскай пушчы.**

Размова па сутнасці

# «ЭКАНАМІЧНАЕ ПАРТНЁРСТВА — НЕ НАВЯЗВАННЕ «НЕЙКАЙ ВОЛІ» ЗВОНКУ»



**Надзвычайны і Паўнамоцны Пасол Расійскай Федэрацыі ў Рэспубліцы Беларусь Дзмітрый МЕЗЕНЦАЎ — суразмоўца ўнікальны. Дыпламат разбіраецца не горш за прафесіянала ў нюансах журналісцкай працы і направіць злёгку расхваляванага інтэрв'юера пры абмеркаванні будучай публікацыі. Прычынай таму не толькі багаты досвед зносін з прэсай, але і асабісты вопыт працы ў СМІ і са СМІ.**

СТАР. 4

Грошы

# КУПЛЯЕМ ТАННУЮ КВАТЭРУ ЦЯПЕР,

## або... Варта яшчэ пачакаць?

**Да завяршэння года засталося два тыдні, таму прыйшоў час падводзіць вынікі. Нашы эксперты падзяліліся, якім быў год для другаснага рынку жылля сталіцы і калі будзе максімальна выгадна купляць кватэру.**

### Калі пануе няўпэўненасць

**Дырэктар агенцтва нерухомасці «БелЦТН» і ганаровы старшыня ГА «Беларуская асацыяцыя «Нерухомасць» Мікалай ПРАСТАЛУПАЎ** расказаў, што пачатак гэтага года не прадвяшчаў для рынку нічога дрэннага. Усе жылі вялікімі надзеямі і разлічвалі, што з надыходам вясны рынак яшчэ больш ажыве. Але ў красавіку да краіны дайшла пандэмія каранавіруса, і да мая стала зразумела, што год будзе цяжкі. «У выніку ў 2020-м агенцтвы нерухомасці ў параўнанні з мінулым годам страцілі 20—30 % сваіх даходаў. Гэта з улікам таго, што рэнтабельнасць рыэлтарскага бізнесу невысокая і складае 5—10 %», — тлумачыць спецыяліст.

СТАР. 5

ISSN 1990 - 763X

ЗВЯЗДА Да чытача з любоўю!

ЗАСТАВАЙЦЕСЯ З НАМІ — БУДЗЕ ЦІКАВА!

Ідзе падпіска на «Звязду» на I квартал або I паўгоддзе 2021 года

НАЛЕТА — З ЛЮБІМАЙ ГАЗЕТАЙ!

З першых вуснаў

# МІНСК — ВАТЫКАН: ЁСЦЬ ПРА ШТО ПАГАВАРЫЦЬ

## Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка сустрэўся з апостальскім нунцыем у Вялікабрытаніі арцыбіскупам Клаўдыа Гуджэроці

**Клаўдыа Гуджэроці займаў пасаду апостальскага нунцыя ў Беларусі ў 2011—2015 гадах. Гэтым разам ён прыехаў у Мінск як спецпасланнік Папы Рымскага Францыска. «Мы з вялікім задавальненнем гатовы вас прыняць як чалавека, які пакінуў добры след пасля сваёй службы. Вы ўсё ж такі правялі не адзін год тут», — сказаў кіраўнік дзяржавы на пачатку сустрэчы.**


Фота БелТА.

«Я вельмі рады, што яго святасць Папа Францыск накіраваў вас у Беларусь. Мне прыемна з вамі сустрэцца, у мяне добрыя ўражанні засталіся ад сустрэч, перамоў, гутарак з вамі, калі вы служылі тут», — дадаў Аляксандр Лукашэнка.

Прэзідэнт папрасіў Клаўдыа Гуджэроці перадаць Папу Рымскаму Францыску самыя цёплыя віншаванні з Новым годам і пажаданні моцнага здароўя. «Калі захварэе, няхай не хвалюецца: мы гатовы прыняць яго на лячэнне, мы ўмеем лячыць. Але зараз лепш не хварэць. І Каляды тут, Новы год, святы — хварэць нам няма калі. Але калі што — адрасу да нас», — жартам прапанаваў кіраўнік дзяржавы.

Арцыбіскуп запэўніў, што абавязкова перадасць гэтыя словы Папу Рымскаму. Кіраўнік Каталіцкай царквы хацеў сустракаць калядныя святы разам з вернікамі, але каранцінныя мерапрыемствы пакуль не дазваляюць гэтага.

Аляксандр Лукашэнка таксама падзякаваў спецпасланніку Папы Рымскага за прыезд, назваўшы яго візіт у Мінск добрым знакам. «Ёсць пра што пагаварыць, у нас заўсёды было шмат тэм. Шматлікія тэмы і застаюцца, іх адразу не вырашыш», — заявіў Прэзідэнт, заўважыўшы, што «нейкія рухі ёсць».

Клаўдыа Гуджэроці таксама лічыць, што за час яго работы ў Беларусі ў бакоў атрымалася шмат што зрабіць для развіцця адносін. «На жаль, вы рана з'ехалі ад нас. Пасля Вялікабрытаніі вам трэба зноў у Беларусь вяртацца», — адказаў кіраўнік дзяржавы. «Пасля Вялікабрытаніі можа быць пенсія. Там не відаць сонца — небяспечна для здароўя», — таксама пажартаваў арцыбіскуп.

Закранаючы тэматыку пандэміі, Аляксандр Лукашэнка заявіў, што ў Беларусі сітуацыя пачала стабілізавацца. «Нам ёсць чаму парадавацца на сённяшнюю раніцу: мы ўжо на працягу двух тыдняў не прырастаем, спыніліся на нейкай адзнацы. А пнеўманіі, што галоўнае, у нас скарачаюцца па 20—30—40 чалавек за суткі. Таму я поўны аптымізму, што нам удасца гэта стрымаць», — сказаў Аляксандр Лукашэнка.

**Паводле БелТА.**

### У тэму

Рымска-каталіцкая царква ў Беларусі — другая па колькасці вернікаў канфесія ў краіне. За апошнія 20 гадоў колькасць рэлігійных суполак РКЦ павялічылася ў чатыры разы, сёння іх налічваецца 498. Яны аб'яднаны ў чатыры епархіі: Мінска-Магілёўскую, Віцебскую, Гродзенскую і Пінскую.

Абшчыны Рымска-каталіцкай царквы маюць 514 касцёлаў, будуецца яшчэ 31. З 1988 па 2020 год дзяржава перадала царкве каля 300 аб'ектаў для рэлігійных мэт.

У Беларусі служаць восем біскупаў РКЦ. Усяго ў парафіях працуюць 453 святары, з якіх 71 — замежныя грамадзяне, пераважна Польшчы. Каталіцкіх святароў у Беларусі рыхтуюць у дзвюх семінарыях — у Гродне і Пінску. З 2009 года функцыянуе катэхетычны каледж для свецкіх у Баранавічах. У 2013 годзе зарэгістраваны Мінскі тэалагічны каледж імя святога Яна Хрысціцеля Мінска-Магілёўскай дыяцэзіі, а ў 2015-м — Тэалагічная акадэмія імя святога Яна Паўла II. Аднак яе будаўніцтва пакуль не пачалося. У 2018 годзе ў Беларусі зарэгістравалі Тэалагічны каледж імя святога Казіміра Гродзенскай дыяцэзіі.

# НЕМАГЧЫМАЕ ЗРАБІЛІ. ТРЭБА ЯШЧЭ КРЫХУ

**Прэзідэнт Аляксандр Лукашэнка прыняў з дакладам старшыню Мінскага абласнога выканаўчага камітэта Аляксандра Турчына.**

У час сустрэчы кіраўніка дзяржавы з губернатарам закраначисленні ў асноўным дзве тэмы — эканамічныя пакказчыкі работы Мінскай вобласці і сітуацыя ў рэгіёне з каранавірусам.

Як далажыў Аляксандр Турчын, паводле папярэдніх даных, за 11 месяцаў гэтага года валавы рэгіянальны прадукт вобласці зафіксаваны на ўзроўні 99,9 %. «Такая лічба нібы і высокая, але крыўдная: недацягнулі 0,1 % да 100 %. Але тым не менш на пачатак года ў нас быў 91 % ВРП, а зараз 99,9 %, то-бок за гэты час вобласць прыбавіла. Мы асцярожна прагназуем, што на ўзровень мінулага года па выніках гэтага года павінны выйсці», — сказаў губернатар.

«Ну, дай бог, — адрэагаваў Прэзідэнт. — Адну дзясятую працэнта недацягваеце... Але снежань яшчэ ў нас ёсць. Быццам бы і нядрэнна. Але як эканаміст ты ж разумееш, што нам патрэбен вынік, таму што спадзявацца, што будучы год у нас будзе добры, нельга. Вы бачыце, што ў нас адбываецца навокал. Таму будзем лічыць, што мы немагчымае зрабілі, але трэба было б яшчэ крыху».

Што датычыцца сітуацыі з захваральнасцю на каранавірус у Мінскай вобласці, то ёсць падставы меркаваць, што рэгіён выйшаў на так званае плато. «Паводле нашых ацэнак, мы заканчваем другі тыдзень ужо, як медыкі кажуць, на плато. Прыросту няма. І па пнеўманіях, і па выяўленых захварэлых мы знаходзімся прыблізна на адным узроўні: ні росту, ні зніжэння», — праінфармаваў кіраўніка дзяржавы Аляксандр Турчын.

**БелТА.**

Блізкая ўлада

# У «ВЕРТЫКАЛІ» СУБОТА — РАБОЧАЯ

**Практыка правядзення прамых ліній рэгіянальнай «вертыкаллю» працягваецца. Калі ў вас ёсць пытанні або праблемы, якія патрабуюць умяшання органаў улады, тэлефануйце.**

Тэлефонныя лініі **ў суботу, 19 снежня, з 9.00 да 12.00** правядуць:

✓ старшыня Брэсцкага аблвыканкама Анатоль Васілевіч ЛІС. Тэл. 8 016 221 31 21;

✓ старшыня Віцебскага аблвыканкама Мікалай Мікалаевіч ШАРСНЁЎ. Тэл. 8 021 222 22 22;

✓ намеснік старшыні Гомельскага аблвыканкама Андрэй Васілевіч КАНЮШКА. Тэл. 8 023 233 12 37;

✓ першы намеснік старшыні Гродзенскага аблвыканкама Іван Алейзавіч ЖУК. Тэл. 8 015 273 56 44;

✓ намеснік старшыні Магілёўскага аблвыканкама Сяргей Мікалаевіч МАСЛАЎ. Тэл. 8 022 250 18 69;

✓ першы намеснік старшыні Мінскага аблвыканкама Сяргей Віктаравіч ЛЯЎКОВІЧ. Тэл. 8 017 500 41 60;

✓ намеснік старшыні Мінскага гарвыканкама Юрый Уладзіміравіч ТРУШЧАНКА. Тэл. 8 017 222 44 44.

Акцэнты

# Бяспека — безумоўны прыярытэт

## На пляцоўцы БелАЭС гатовыя прыняць еўрапейскіх экспертаў у любы час

**Аб гэтым паведаміла прэс-служба Мінэнерга ў тэлеграм-канале ведамства, адрэагаваўшы на заяву міністра замежных спраў Літвы.**

«Перш чым рабіць гучныя заявы аб «бездаказным стаўленні Беларусі да ядзернай бяспекі», неабходна мець сур'ёзныя аргументы. Але мы іх не чуем, таму што іх проста няма. Такога роду спроба нанесці ўдар па рэпутацыі нашай краіны наўрад ці будзе ўспрымацца сур'ёзна міжнароднай супольнасцю. Бо, як вядома, каб нешта даказаць, патрэбны факты», — гаворыцца ў паведамленні.

У Мінэнерга акцэнтуюць увагу на тым, што Беларусь супрацоўнічала і мае намер далей супрацоўнічаць з Еўрапейскай групай рэгулюючых органаў у галіне ядзернай бяспекі (ENSREG). Паміж прадстаўнікамі гэтай аўтарытэтнай арганізацыі і беларускімі спецыялістамі выбудаваны канструктыўныя працоўныя адносіны. Паэтапна вядзецца дыялог у рамках партнёрскай ацэнкі нацыянальнага плана дзеянняў нашай краіны па выніках стрэс-тэстаў БелАЭС, якія Беларусь правяла па працэдуры Еўрапейскага саюза на добраахвотнай аснове.

«На атамнай станцыі старанна рыхтаваліся да візіту еўрапейскіх спецыялістаў. Эксперты прынялі рашэнне не ехаць — гэта іх права. Як бы там ні было, на пляцоўцы БелАЭС іх гатовыя прыняць у любы іншы час», — звяртае ўвагу прэс-служба і канстатуе, што на гэтым фоне імкненне літоўскіх чыноўнікаў зрабіць беларускі бок «крайнім» і прадэманстраваць Еўропе «безадказнае стаўленне Беларусі да ядзернай бяспекі» выглядае проста шуміхай вакол рабочай сітуацыі.

«Наша краіна, якая перажыла трагедыю Чарнобыля, добра ўсведамляе той высокі ўзровень адказнасці, які ляжыць у аснове вялікага праекта БелАЭС. Бяспека заўсёды была і застаецца безумоўным прыярытэтам на ўсіх этапах будаўніцтва станцыі», — рэзюмавалі ў міністэрстве.

**Вольга АЛЯКСАНДРАВА.**

# ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

## Кошт біткойна ўпершыню ў гісторыі перавысіў $22 тысячы



Гэта вынікае з даных анлайн-біржы CoinMarketCap. Паводле яе звестак, крыптавалюта падаражэла на 14,37 працэнта за суткі і дасягнула $22 149. У лістападзе кошт біткойна пабіў усталяваны напрыканцы 2017 года рэкорд, падняўшыся вышэй за $19 800. Адзнаку ў $20 000 крыптавалюта ўпершыню пераадолела ў сераду. На гэтым тыдні яна падаражэла прыкладна на 20 працэнтаў, а за год вырасла больш чым утрая, адзначае Bloomberg. Некаторыя эксперты лічаць, што біткойн выцясняе золата з пазіцыі актыву, які купляецца для дыверсіфікацыі партфеля на фоне слабасці долара і патэнцыйнага інфляцыйнага ціску, паведаміў Bloomberg. Іншыя бачаць у тым, што адбываецца, спекуляцыі, якія непазбежна прывядуць да падзення, падобнага на тое, што пачалося тры гады таму пасля магутнага ралі крыптавалюты.

## У Токіа абвешчаны максімальны ўзровень пагрозы



Адміністрацыя японскай сталіцы ўпершыню з пачатку пандэміі павысіла ўзровень гатоўнасці сістэмы аховы здароўя да найвышэйшага, чацвёртага, узроўню з-за росту захворванняў COVID-19. Як паведаміла Kyodo News, сутачны прырост новых выпадкаў заражэння ў горадзе ўпершыню перавысіў 800. Падчас абмеркавання сітуацыі ў мэрыі камісія экспертаў-медыкаў папярэдзіла, што нагрузка на сістэму аховы здароўя павялічваецца і ўсё больш бальніц вымушаны класці хворых на каранавірусную інфекцыю на звычайныя ложкі. Як лічаць спецыялісты, калі цяперашняя сітуацыя зацягнецца яшчэ на два тыдні, у сістэмы могуць пачацца сур'ёзныя праблемы і збоі.

## Кітайскі касмічны апарат даставіў на Зямлю ўзоры месяцавага грунту



Кітайскі касмічны карабель «Чан'э-5», на борце якога знаходзіцца ўзоры месяцавай пароды, прызямліўся ў пустыні ва Унутранай Манголіі, што на поўначы Кітая. Месцазнаходжанне 300-кілаграмовай капсулы было аператыўна выяўлена, паведаміла кітайскае дзяржаўнае тэлебачанне. Такім чынам, КНР стаў трэцяй у свеце краінай пасля ЗША і СССР, якой удалося даставіць на Зямлю ўзоры месяцавага грунту. Па плане апарат павінен быў сабраць каля двух кілаграмаў узораў. Як вядома, «Чан'э-5» адправіўся ў космас 24 лістапада, спушчальны апарат дасягнуў месяцавай паверхні ў Акіяне штармоў тыднем пазней. Гэты бок спадарожніка чалавецтва даследуе ўпершыню. «Месяц — свайго роду капсула часу, — заўважыў дырэктар Нацыянальнай касмічнай акадэміі Вялікабрытаніі Ану Оджа. — Узоры пароды дапамогуць лепш зразумець асаблівасці гісторыі Сонечнай сістэмы».

# ПА ТОНКІМ ЛЁДЗЕ

**Чаму не варта распачынаць зімовую рыбалку?**

Сёлетні снежань па кліматычных характарыстыках ужо куды больш блізкі да таго, каб звацца зімовым месяцам. На мінулым тыдні выдалася некалькі даволі марозных і сонечных дзён, калі нават удзень паветра не магло прагрэцца больш за чатыры градусы са знакам «мінус». Адпаведна, на вадаёмах пачало ўтварацца трывалае ледзяное покрыва.

Толькі па стане на 11 снежня ў краіне па прычыне нетрывалага лёду патанулі пяць чалавек. Гэтымі данымі падзяліліся ў рэспубліканскай вадалазна-выратавальнай службе Таварыства ратавання на водах.

— На Мёршчыне 8 снежня знайшлі чалавека, які ўмёрз у лёд у межах пажарнага вадаёма, — расказалі ў грамадскай арганізацыі. — Што менавіта адбылося з 54-гадовым мужчынам, пакуль невядома. Прычыны і абставіны здарэння высвятляюцца. У гэты ж дзень здарылася яшчэ адна трагедыя на возеры Слабадскім каля вёскі Стрыжава Бешанковіцкага раёна: гэтым разам падчас рыбалкі лёд праламаўся пад 52-гадовым мужчынам. Цікава, што на той дзень у краіне трывала адмоўныя тэмпературы паветра, якія спрыялі нарастанню лёду, трымаліся ўсяго другія суткі. Свае карэктывы ўносіў і вецер. Колькі ахоўных сантыметраў змагло нарасці пры такіх умовах — пытанне рытарычнае.

9 снежня на возеры Лучайскім каля вёскі Гаўрыловічы Пастаўскага раёна было знойдзена цела мужчыны, які знік 27 лістапада. Мяркуецца, што ён з берага вудзіў рыбу, але аступіўся і ўпаў у ваду. Яшчэ адна рыбалка скончылася нешчасліва на возеры каля вёскі Урбаны Ушацкага раёна. А ў мінулую пятніцу драма адбылася на возеры Верхнім у Чэрыкаўскім раёне. Там пад лёд праваліўся 15-гадовы падлетак і назад выбрацца не здолеў.

Правілы паводзін на лёдзе нагадалі ў Мінскай гарадской арганізацыі Таварыства ратавання на водах.

— Бяспечная таўшчыня лёду складае не менш за 7 сантыметраў. На трываласць яго можна праверыць ударам кія. Калі пасля першага ж удару лёд прабіўся, то трэба неадкладна вярнуцца назад да берага. Рухацца трэба па сваіх слядах, не адрываючы падэшвы ад лёду. І нават калі лёд здаецца трывалым, усё роўна трэба рухацца вельмі асцярожна. Небяспечных і падазроных месцаў можа быць шмат. Гэта месцы, дзе ўпадаюць ручаі, выходзяць грунтавыя воды і крыніцы, скідваюцца сцёкавыя воды. Праблему могуць ствараць і кусты водарасцяў. Выходзіць на лёд лепш у светлы час сутак. Рыбакам жа мы рэкамендуем не прабіваць шмат лунак на блізкай адлегласці, скакаць і бегаць па лёдзе, збірацца вялікімі групамі. І абавязкова апрануць выратавальную камізэльку, а таксама мець пры сабе лінь даўжынёй у 15—20 метраў, дзе на адным канцы будзе пятля, а на другім — груз вагой 400—500 грамаў. Яны дапамогуць, калі чалавека давядзецца цягнуць з палонкі. Пасля гэтага трэба неадкладна выклікаць хуткую дапамогу.

Зараз слупок тэрмометра зноў палез уверх і «скача» праз нулявую адзнаку. Спецыялісты кажуць, што такія ўмовы надвор'я для шпацыраў па лёдзе або зімовай рыбалкі не самыя лепшыя. Справа ў тым, што шмат лёду за кароткі час нарасці не паспела. А той, які ёсць, пры слабых станоўчых тэмпературах удзень пакрысе растае. Уначы ж невялікі мінус «прыхоплівае» ўтвораную лужыну. Так лёд па сваёй структуры нагадвае ўжо не суцэльнае покрыва, а плітку порыстага шакаладу. І наколькі хопіць рэсурсу гэтых пор — не ведае ніхто.

Паводле карты гідралагічных назіранняў у Беларусі, размешчанай на сайце Белгідрамета, ледаставу на рэках і азёрах краіны, за рэдкім выключэннем, амаль няма. Пераважная большасць вадаёмаў мае ў самым лепшым выпадку ледзяное покрыва з палонкамі. Заберагі і шугаходы таксама не рэдкасць — ды і лёдам гэта назваць, па сутнасці, нельга. Так што застаецца толькі чакаць, калі ж мароз зноў набярэ моц.

**Валяр'ян ШКЛЕННІК.**

Надвор'е

# Суровы снежань адмяняецца

**У краіне пануе Атлантыка, якая «робіць» тэмпературу на 2—4 градусы вышэйшай за норму**

**Вось і не адгадалі мы з маразамі. Прымаючы да ўвагі першую палову снежня, калі па тэмпературным рэжыме яна аказалася ў межах кліматычнай нормы, можна было чакаць сапраўднай зімы. Але ж не. У цяперашні час па краіне адзначаецца цёплае надвор'е з тэмпературай паветра на 3 градусы вышэйшай за сярэднія шматгадовыя значэнні. Такі высокі тэмпературны фон забяспечвае Атлантыка, якая працягвае запампоўваць у Беларусь цёплае і вільготнае паветра, паведамляюць спецыялісты Рэспубліканскага цэнтра па гідраметэаралогіі, кантролі радыеактыўнага забруджвання і маніторынгу навакольнага асяроддзя Мінпрыроды.**

Сёння ўдзень будзе адчувацца ўплыў атмасфернага фронту. Захаваецца цёплае надвор'е. На большай частцы тэрыторыі краіны чакаюцца мокры снег і дождж. У асобных раёнах магчымы туман, слабы галалёд, на дарогах галалёдзіца. Вецер прагназуецца паўднёвы, паўднёва-заходні ўмераны. Максімальная тэмпература паветра будзе ад нуля да плюс 5 градусаў.

А вось у суботу ўначы надвор'е будуць фарміраваць атмасферныя франты, якія ссоўваюцца да нас з боку Заходняй Еўропы. Удзень надвор'е абумовіць вобласць павышанага атмасфернага ціску, толькі на паўночным усходзе захаваецца ўплыў атмасфернага фронту. Уначы месцамі, а ўдзень па паўночным усходзе краіны пройдуць кароткачасовыя апалкі ў выглядзе мокрага снегу і дажджу. Месцамі чакаецца туман, слабы галалёд, уначы і раніцай на дарогах галалёдзіца. Вецер прагназуецца паўднёва-заходні ўмераны. Тэмпература паветра ўначы складзе ад мінус 3 градусаў да 3 цяпла, а ўдзень будзе ад 2 марозу да плюс 5 градусаў.

Згодна з сінаптычнымі картамі, у нядзелю і панядзелак надвор'е ў асноўным будзе знаходзіцца ва ўладзе вобласці павышанага атмасфернага ціску. У нядзелю пераважна без ападкаў. Толькі ўначы месцамі па паўночным усходзе краіны пройдуць кароткачасовыя мокры снег і дождж. У асобных раёнах чакаецца туман, слабы галалёд, уначы і раніцай на дарогах галалёдзіца. Тэмпература паветра ўначы складзе ад мінус 4 да плюс 2 градусаў, удзень — ад 2 марозу да 5 цяпла.

Паводле папярэдніх прагнозаў айчынных сіноптыкаў, у панядзелак будзе пераважна без ападкаў. Месцамі чакаецца туман, слабы галалёд, уначы і раніцай на дарогах галалёдзіца. Вецер прагназуецца паўднёвы, уначы ўмераны, удзень парывісты. Тэмпература паветра ўначы складзе ад мінус 3 градусаў да 2 цяпла, па ўсходзе пры праясненнях — 4—6 марозу. Удзень будзе ад мінус 1 градуса да 4 градусаў вышэй за нуль.

Дарэчы, нам апошнім часам відавочна не хапае снегу. І гэта факт. Як адзначаюць спецыялісты, у краіне назіраецца востры недабор ападкаў, калі іх колькасць за першую палову снежня не дацягвае нават да паловы неабходнага па календары...

**Сяргей КУРКАЧ.**

Электрамабілі

# Шэсць рублёў за сто кіламетраў

**Вытворчае аб'яднанне «Беларуснафта» з'яўляецца выключна камерцыйным прадпрыемствам, таму нікога не здзівіла тая навіна, што з першых дзён студзеня стане платнай зарадка электрамабіляў на ўсіх электразаправачных станцыях Malanka.**

Прыемным сюрпрызам гэтай навіны будуць бюджэтныя тарыфы самой зарадкі. Кошт 1 кВт на станцыях пастаяннага току (хуткія ЭЗС) складзе 39 капеек, на станцыях пераменнага току (павольныя) — 29 капеек. Аплаціць зарадку можна будзе з дапамогай мабільнай праграмы Malanka, якая ў тэставым рэжыме працуе ўжо некалькі месяцаў.

Дарога гэта або пакуль не вельмі? З увядзеннем аплаты электрапаліва ў нашай краіне будзе ў два разы танней за бензін. Зарадка электракара на 100 кіламетраў абыдзецца электрамабілістам у суму каля шасці рублёў у залежнасці ад тыпу зараду. Аўтамабіль з рухавіком унутранага згарання патрацiць на пераадоленне такой жа адлегласці каля 10 літраў бензіну, што складзе 18-20 рублёў. Адчуваеце розніцу?

«Зарадка электрамабіляў у Беларусі была бясплатная з 2014 года, з моманту з'яўлення першых ЭЗС. Так доўга бясплатныя станцыі не былі ні ў адной краіне свету. Але нават з увядзеннем тарыфу кошт зарадкі будзе самы нізкі ў Еўропе. Такі кошт на электрычнасць застанецца дзякуючы ў тым ліку і ўвядзенню ў эксплуатацыю Беларускай АЭС. Сёння на асобных ЭЗС у сталіцы ў дзень зараджаецца да 10 аўтамабіляў, што блізка да стандартных значэнняў і кажа пра тое, што мы гатовыя пераходзіць на новы этап работы», — расказвае **намеснік генеральнага дырэктара ВА «Беларуснафта» Андрэй КОЦІК.**

**Сяргей КУРКАЧ.**

Будзь у курсе!

## У ТЭСТАВЫМ РЭЖЫМЕ

**Напярэдадні вечарам спецыялісты пратэсціравалі работу галоўнай ёлкі горада, якая ўстаноўлена на плошчы Леніна ў Брэсце. Відэа і фота з мерапрыемства падзяліўся ў сваім тэлеграм-канале старшыня гарвыканкама Аляксандр РАГАЧУК.**



Вакол зялёнай прыгажуні ўжо ўзведзены цэлы казачны гарадок з дамкамі-церамкамі, навагоднімі інсталяцыямі, роставымі лялькамі Дзеда Мароза і Снягуркі. Па плошчы таксама будзе курсіраваць вясёлы цягнік. І яшчэ шмат цікавінак абяцаюць арганізатары ў навагоднія дні. А ўрачыстае адкрыццё ёлкі запланавана на пятніцу, 18 снежня.

**Святлана ЯСКЕВІЧ.**



# «ЭКАНАМІЧНАЕ ПАРТНЁРСТВА — НЕ НАВЯЗВАННЕ «НЕЙКАЙ ВОЛІ»

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

У 27 гадоў, завяршаючы двухгадовую службу лейтэнантам, прызваным з запасу, ён адмовіўся ад прэстыжнай пасады на Кастрычніцкай чыгунцы, вырашыўшы прыйсці ў вайсковы друк. Менавіта са сферай журналістыкі будзе многія гады звязана праца Дзмітрыя Мезенцава: і ў мэрыі Санкт-Пецярбурга, і ў Дзяржаўным камітэце Расіі па друку, і ў Савеце Федэрацыі Федэральнага сходу. Нават сёння, узначальваючы дыппрадстаўніцтва Расіі, пасол прызнаецца, што часам дапамагае прэс-службе парадай. У нашай размове з Дзмітрыем Фёдаравічам мы, безумоўна, не абышлі тэму медыя. Але асноўную ўвагу надалі эканамічным і гуманітарным адносінам Беларусі і Расіі.



Фота Яўгена ПЯСЕЦКАГА.

Дзмітрый МЕЗЕНЦАЎ дэманструе нашаму карэспандэнту карту ВКЛ, якая знаходзіцца ў Пасольстве Расіі.

## Пра Форум рэгіёнаў

**— Гэты год аказаўся няпросты для Беларусі, Расіі і нашых адносін. Былі перыяды недаверу, потым афіцыйная падтрымка, але, што несумненна, ніхто ў Расіі не застаўся абыякавы да таго, што адбываецца ў нашай краіне. Чым гэты год у беларуска-расійскіх адносінах запомніўся вам?**

— Традыцыйна значныя перагаворы Прэзідэнта Расіі Уладзіміра Пуціна і кіраўніка беларускай дзяржавы Аляксандра Лукашэнкі. У ходзе такіх сустрэч, нягледзячы на COVID-19, былі абмеркаваны найважнейшыя пытанні двухбаковага парадку, самае шырокае кола тэм.

Паспяхова напрацоўваецца сістэма адносін урадаў Міхаіла Мішусціна і Рамана Галоўчанкі, пацверджана значнасць задзелаў у сумеснай працы федэральных і рэспубліканскіх міністэрстваў і ведамстваў па інтэграцыйным парадку дня.

Асаблівай падзеяй стаў VII Форум рэгіёнаў Беларусі і Расіі, за правядзенне якога традыцыйна адказваюць старшыня Савета Федэрацыі Валянціна Матвіенка і старшыня Савета Рэспублікі Наталля Качанава, каманды сенатараў. Нягледзячы на тое што з-за ковіда ён прайшоў у рэжыме анлайн, практыка адносін, напрацаваны вопыт супрацоўніцтва рэгіёнаў Беларусі і суб'ектаў Расійскай Федэрацыі пазначана як найважнейшая перспектыва міждзяржаўных адносін. І тое, што кіраўнікі дзяржаў (Прэзідэнт Расіі Уладзімір Пуцін і Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка), абласцей краіны і суб'ектаў федэрацыі традыцыйна віталі форум, абазначыла маштабныя задачы супрацоўніцтва.

Лічым, што эканоміка павінна дамінаваць у сістэме нашых двухбаковых адносін. І разумеем збалансаваны прагматызм партнёраў. Неабходна забяспечыць загрузку беларускіх прамысловых гігантаў, было важна пацвердзіць іх арыентаванасць на ёмісты расійскі рынак. Важна сказаць і пра тое, што адносіны рэгіёнаў і гарадоў-пабрацімаў павінны мець змястоўнае напаўненне.

**— Маючы гуманітарную тэматыку ў гэтым годзе (прысвечаны 75-годдзю Перамогі ў Вялікай Айчыннай вайне), ці атрымалася Форуму рэгіёнаў надаць дынаміку дзелавым кантрактам?**

— На форуме было падпісана пагадненняў на суму больш як 700 мільёнаў долараў ЗША. Гэта на 200 мільёнаў больш, чым на VI Форуме ў Санкт-Пецярбургу ў 2019 годзе. VII Форум рэгіёнаў у Мінску атрымаў у спадчыну дынаміку кантактаў, закладзеную ў апошнія гады на форумах у Санкт-Пецярбургу, Маскве, Магілёве... Важна, што пост-выбарныя падзеі ў Беларусі ніяк не перашкодзілі гэтай значнай сустрэчы.

## Пра дарожныя карты і цэны на газ

**— Пачынаўся гэты год з эканамічных спрэчак, складанасцяў па ўзгадненні дарожных карт па будаўніцтве Саюзнай дзяржавы Беларусі і Расіі. На якім этапе гэтая работа сёння і ў чым яе практычная значнасць для грамадзян?**

— Кіраўніком расійскай дзяржавы Уладзімірам Пуціным пацверджана прынцыповая падтрымка беларускага народа і брацкай Беларусі — у сістэме фінансавых, эканамічных, сацыяльных адносін і ўзаемадзеяння ў сферы абароны і сумеснай бяспекі. Вельмі важна, каб такія падыходы падзялялі не толькі кіраўнікі ў высокіх кабінетах, дырэктары вытворчасцяў, навучальных устаноў, але і мільёны грамадзян Беларусі і Расіі — найбліжэйшых краін-саюзніц. Пашырэнне расійскай падтрымкі пацвярджаецца новымі працоўнымі месцамі, гарантыямі збыту прадукцыі беларускіх прадпрыемстваў, а значыць, дастаткам у тысячах сем'яў у братэрскай краіне.

Вельмі хочацца, каб у тых, хто цяпер толькі ўступае ў дарослае жыццё, было адчуванне: іх Радзіма — гэта не толькі прыгожая, дагледжаная, ладная Беларусь, але і велізарная Айчына — ад Брэста і да Сахаліна. У гэтым плане нам варта зрабіць яшчэ шмат крокаў насустрач. Маладыя людзі Беларусі павінны разумець: і руская Поўнач, і Сібір, і Байкал, і Прымор'е, і Паўночны Каўказ, і Масква, і Пецярбург — таксама іх Радзіма. Гэта складана ўспрымаецца нашай моладдзю: яны не раслі ў рамках адзінай Айчыны і яе традыцый.

Мы ведаем, што ёсць Саюзная дзяржава, але не заўсёды разумеем і адчуваем, што гэта ўжо рэальны факт жыцця мільёнаў грамадзян. Той, хто пацвердзіў сістэму льгот, правa на бесперашкоднае працаўладкаванне, навучанне, медыцынскае, пенсійнае забеспячэнне, лічыць, што гэта адбываецца само па сабе. Хто не ведае гэтага, не бачыць пераваг па-свойму ўнікальнага міждзяржаўнага аб'яднання. Велізарны патэнцыял Саюзнага дагавора, падпісанага больш за 20 гадоў таму, патрабуе большага раскрыцця.

Некаторыя бачаць у «дарожных картах» саюзнага будаўніцтва эканамічны «палон» для Беларусі, а сёй-той — страту незалежнасці і суверэнітэту. Адкажу. Ніхто і ніколі ў нас не думаў трактаваць эканамічнае партнёрства як навязванне «нейкай волі» звонку. Добра разумеем, што інтэграцыя будзе паспяховая тады, калі акажацца ўзаемавыгаднай і зробіць нас мацнейшымі.

**— Кожны год нашы краіны традыцыйна заканчваюць вырашэннем пытання цаны на газ. З якімі яшчэ праблемамі мы ўваходзім у новы год?**

— Мы з вамі гаварылі пра «дарожныя карты» — праекты новых праграм супрацоўніцтва. Там прапісаны найважнейшыя рэчы — стратэгія ўзаемадзеяння на гады наперад: гэта і пытанні стварэння адзінага рынку нафты, газу, адзіных падыходаў рэалізацыі прамысловай палітыкі, узаемадзеяння ў дзясятках іншых кірункаў. Адзін з прынцыпаў, які вылучаецца беларускімі партнёрамі, — фарміраванне аднолькавых цэн на рэсурсы. Але да гэтага часу, пакуль гэта не стала правілам, не падтрымана менавіта двума бакамі, гэта пакідае за гаспадарчымі суб'ектамі права змагацца за максімальны прыбытак. Заўсёды будзе канфлікт прадаўца і пакупніка, але гэта ніяк не звязана з нашымі глыбокімі гістарычнымі традыцыямі, гуманітарным узаемадзеяннем, палітычным супрацоўніцтвам. Імкненне аднаго боку прадаць даражэй, як і другога — купіць танней, — аснова рынкавай эканомікі.

Калі мы зараз гаворым пра самастойнасць і незалежнасць, то, натуральна, эканоміка, якая грунтуецца ў нашых краінах на рынкавых прынцыпах, — гэта эканоміка дагавора, які бакі абавязаны выконваць. Пакуль няма выйсця на адзіны рынак нафты і газу, зразумела, не выключаны спрэчкі гаспадарчых суб'ектаў.

Павінен адзначыць: запыт беларускага боку па цэнах на нафту сёлета быў улічана расійскімі партнёрамі на сто працэнтаў. Усё, што запытвала беларускае кіраўніцтва па гэтай тэме, было пачута. Вызначана максімальна льготная цана — з улікам «нафтавай кан'юнктуры», якая склалася на знешніх рынках. Расія пайшла на беспрэцэдэнтныя меры ў рамках падтрымкі міжбюджэтных адносін. Што датычыцца цаны на газ, мы не раз чулі ад партнёраў, што яна высокая, і былі выпадкі, калі спотавая цана ў Еўропе была ніжэйшай, чым цана, зафіксаваная дагаворам паміж краінамі ў лютым 2020 года, але былі іншыя «выпадкі»: калі расійская цана была значна ніжэйшай за еўрапейскую.

Але казаць трэба пра тое, што збліжае эканомікі, робіць нас мацнейшымі, фарміруе стратэгію на дзесяцігоддзі і забяспечвае энергабяспеку Беларусі. Справа нават не ў тым, ці ёсць спрэчка. Справа ў іншым: як мы гатовы знаходзіць кампрамісы. Мяркую, сёння мы больш гатовы да гэтага, чым яшчэ ў пачатку года.

## Пра агульную памяць і гарады-пабрацімы

**— Дзмітрый Фёдаравіч, вы ў сваёй дзейнасці надаяце вялікую ўвагу інтэнсіфікацыі культурнага супрацоўніцтва Беларусі і Расіі. У гэтым годзе асноўны акцэнт быў зроблены на захаванне агульнай памяці аб падзеях Вялікай Айчыннай вайны. Прайшло шмат мерапрыемстваў у Беларусі з удзелам расійскага дыпламатычнага прадстаўніцтва. Як вы гледзіце на абвінавачванні беларусаў і расіян, што нас больш аб'ядноўвае мінулае, чым будаўніцтва на яго базе будучыні?**

— Нядаўна я ўдзельнічаў у мінскай канферэнцыі па недапушчэнні геразіацыі нацызму. Вывучыў прэзентацыю аб калабарацыянісцкім сцягу, падрыхтаваную да гэтага мерапрыемства дэпутатам Палаты прадстаўнікоў Ігарам Марзалюком. Маладыя хлопцы, не разумеючы гісторыі сімвалаў, маршыруюць з ім. Гэта апаганьвае, прыніжае памяць загінулых у гады Вялікай Айчыннай вайны. І нам трэба аб гэтым казаць.

Мой бацька ваяваў на ІІІ Беларускім фронце і скончыў вайну ў Кёнігсбергу. Памятаю размовы і сустрэчы з людзьмі, якія ваявалі. Для іх не было гэтай спрэчкі пра сімвалы, якая сёння навязваецца і ў якой ёсць стратэгічная задача — зрабіць усё, каб ацэнка нeверагоднага подзвігу савецкага народа і савецкага салдата была заменена зусім іншай удзячнасцю.

Калі ты адчуваеш сябе грамадзянінам сваёй краіны, то не можаш садзейнічаць таму, каб на тваю Айчыну накладвалі санкцыі, ты не маеш ніякага права весці падрыўную працу праз некамерцыйныя і няўрадавыя арганізацыі супраць роднай зямлі. Важна памятаць, што крушэнне Савецкага Саюза стала падставай для заявы Джорджа Буша-старэйшага: «Мы перамаглі ў «халоднай вайне». Значыць, вайна была. А сёння? У інфармацыйнай прасторы — за душы і розумы маладых людзей, якія фарміруюць будучыню Беларусі і будуць вызначаць, якім стане дыялог з Расіяй — праз 10-15-30 гадоў.

**— Важным элементам у сувязях нашых дзвюх краін заўсёды былі народная дыпламатыя і кантакты гарадоў-пабрацімаў. Якую ролю, на ваш погляд, гэты элемент супрацоўніцтва іграе сёння?**

— Як чалавек, які прайшоў «прыступку» губернатара, веру ў паспяховасць міжрэгіянальнага супрацоўніцтва і ўзаемадзеянне гарадоў-пабрацімаў яшчэ і таму, што на гарызантальным узроўні лягчэй дамаўляцца, весці дыялог, выходзіць на падпісанне дакументаў. Безумоўна, такая работа вядзецца па ўзгадненні са сталіцамі, але ступень манеўру, эканамічнай, гуманітарнай свабоды ў рэгіёнаў высокая. Важна, каб была і змястоўнасць працы, каб гэта неператваралася ў фармальныя пратакольныя адносіны. У 50 беларускіх гарадоў звыш 100 пабрацімаў у Расіі. Гэта павінна дапамагаць людзям у нашых краінах лепш пазнаваць адзін аднаго.

## Пра ролю медыя і псіхалогію

**— У вашым лёсе значнае месца займае журналістыка. На ваш погляд, як сёння трансфармавалася роля СМІ ў свеце? Як вы думаеце, тэлеграм-каналы і блогеры стануць альтэрнатывай традыцыйным медыя?**

— Адмовіўшыся ад прэстыжнай пасады начальніка вакзала ў Ленінградзе, я цалкам свядома прыняў рашэнне сысці ў вайсковы друк, асвоіць новую спецыяльнасць — ваенную журналістыку. Пачынаў з першаснай пасады, пайшоў працаваць у дывізіённую газету, каб навучыцца пісаць у розных жанрах: ад нататкі да нарыса.

Перакананы, што гэтая цудоўная прафесія дазваляе быць у гушчы падзей і прапаноўваць твайму чытачу, гледачу сваю ацэнку падзей. Лічу гэта правам і гонарам і вялікай адказнасцю. Цэнзура, якая існавала, прымушала быць яшчэ больш прыдзірлівым да таго, як рыхтуеш матэрыял, правяраеш факты.

Што датычыцца тэлеграм-каналаў... Ці стаіць пытанне гонару перад многімі людзьмі, якія куражацца ў блогасферы, не адказваючы нічым (ні прафесійным імем, ні датычнасцю да прэстыжнай прафесіі)? Гэта зусім іншая «журналістыка», якая такою і не з'яўляецца. Я не прыхільнік захавання цэнзуры, але калі яе няма, то павінна быць сістэма ўнутранага кантролю і адказнасці за выверанасць кожнага слова і кожнай ацэнкі, таму што яны ўплываюць на падзеі і лёсы людзей.

Калі быў старшынёй Камісіі Савета Федэрацыі па інфармацыйнай палітыцы, то адстойваў максімальную свабоду інтэрнэту, свабоду творчасці. Але лічу, што гэта павінна кампенсавацца нарастаючай прафесійнай адказнасцю, увагай да кожнага аўтара з боку інстытутаў, якія адстойваюць этыку і гонар медыя. Сёння многія людзі, маючы свабоду прадстаўлення свайго меркавання, не заўсёды «нагружаны» глыбокім разуменнем таго, што яны фарміруюць настроі ў грамадстве, мадэлі будучага і цяперашняга грамадскага жыцця. Гэта адваротны бок свабоды і вялізнага рэсурсу, які даў інтэрнэт.

**— Ваша дысертацыя на атрыманне вучонай ступені кандыдата псіхалагічных навук была прысвечана псіхалогіі ўплыву СМІ на фарміраванне палітычных установак асобы. Чаму выбралі гэты кірунак для вывучэння?**

— Гэта вынік сыходу ў журналістыку. Да гэтага я працаваў над дысертацыяй па эканамічнай тэматыцы — з улікам сваёй першай адукацыі. Калі сышоў у газету, задумаўся, як магу ацаніць ролю СМІ ў грамадстве. Так нарадзілася тэма. Гэта быў перыяд завяршэння існавання СССР... Я бачыў, што савецкі друк — нефармалізаваны інстытут выхавання. У сваёй працы апісваю, што такое інфармацыйны фантом і як яго распазнаць. Сёння гэта паняцце вядома як «фэйк».

**— Псіхалогія засталася вашым захапленнем?**

— Хутчэй на штодзённым узроўні, калі ты ацэньваеш свет і людзей вакол. Чалавек на дыпламатычнай службе абавязаны ўлічваць рэакцыю партнёра. Калі дыпламатыя — прафесія, якая павінна «зразаць» вастрыню, дапамагаць пазбягаць канфліктаў, пры гэтым абараняючы нацыянальныя інтарэсы, то ў нейкай ступені псіхалогія са мной заўсёды. З 2008 года мне даручана загадваць кафедрай палітычнай псіхалогіі ў Санкт-Пецярбургскім дзяржуніверсітэце. Зараз я не вельмі добрасумленны загадчык з прычыны сваіх клопатаў. Дыпламатычная служба не дазваляе часта бываць у Санкт-Пецярбургу,

## ЗВОНКУ»

з гэтай нагоды перажываю, але ўдзячны за разуменне з боку кіраўніцтва ўніверсітэта, маіх прафесійных калег.

Палітычная псіхалогія — вельмі цікавая спецыяльнасць, якой нядаўна споўнілася 30 гадоў. Яна з'явілася як вынік дэмакратызацыі, адкрытасці да свету, якую дэманстраваў Савецкі Саюз. Зараз гэта цалкам забыта нашымі заходнімі партнёрамі, якія спрабуюць сёння размаўляць з Расіяй як са слабым гульцом.

### Пра падарункі Жыровіцкай абіцелі

**— Расійская дыпмісія заўсёды надавала вялікае значэнне адносінам з духавенствам. Распавядзіце пра вашу работу з Беларускай праваслаўнай царквой, са знакамітым Жыровіцкім манастыром.**

— Мы адгукнуліся на зварот настаяцеля Свята-Успенскага Жыровіцкага манастыра архіепіскапа Навагрудскага і Слонімскага Гурыя разгледзець магчымасць забяспечыць адліўку званоў да 500-гадовага юбілею цудоўнай абіцелі. Калі ўладыка Гурый пазначыў такі запыт, мы ў тую самую хвіліну атрымалі водгук ад кіраўніцтва банкаў «ВТБ» і «ВТБ» (Беларусь). Ва ўзаемадзеянні з губернатарамі Наўгародскай вобласці Андрэем Нікіціным і Варонежскай вобласці Аляксандрам Гусевым і кіраўніцтвам званаліцейнага завода ў Варонежы былі адліты ўсе 12 званоў, самы вялікі з якіх важыць больш за 4 тоны. З мітрапалітам Мінскім і Заслаўскім, Патрыяршым Экзархам усяе Беларусі Веніямінам і членамі Архітэктурна-мастацкага савета Мінскай епархіі зусім нядаўна абмяркоўвалі пытанні падрыхтоўкі будаўніцтва новай званіцы на тэрыторыі манастыра, якая таксама, як і званы, стане дарам манастыру ад расійскага боку. Гатоўнасць да ўдзелу Свярдлоўскай вобласці і яе губернатара Яўгена Куйвашава падтрымаць запыт на будаўніцтва новай званіцы ў абіцелі цяжка пераацаніць — велізарная падзяка. Намер удзельнічаць у такой працы выказаў у ходзе візіту ў Мінск і губернатар Омскай вобласці Аляксандр Буркоў. Месца будаўніцтва ўжо выбрана і асвечана. Там будзе і тое, без чаго не можа жыць манастыр, — храм, бібліятэка і музей.

**— Што б вы маглі пажадаць жыхарам Беларусі і Расіі на парозе будучага года?**

— Важна памятаць, што кан'юнктура знешніх падзей, навязаных і лжыва зразумелых, хутка заканчваецца. А сістэма адносін са светам, з канкрэтнымі людзьмі — вялікая дадзенасць і дарагога вартая, каб разменьваць яе, купіўшыся на хлуслівыя абяцанні. Хай нам удаецца кожным днём знаходзіць дакладныя ацэнкі падзей, удзельнікамі якіх мы з'яўляемся, каб, выбудоўваючы свае крокі па жыцці, памятаць: самае дарагое, што ў нас ёсць, — адносіны з блізкімі і роднымі людзьмі, з калегамі і партнёрамі, і ў Расіі і Беларусі — адзіная гісторыя і надзейная будучыня.

Марыя ДАДАЛКА.

# КУПЛЯЕМ ТАННУЮ КВАТЭРУ ЦЯПЕР, АБО...

***(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)***

Кіраўнікі найбуйнейшых агенцтваў нерухомасці адзначаюць, што ў лютым і сакавіку здзелкі здзяйсняліся на рынку актыўна: прыкладна на ўзроўні 2019 года. Але ў красавіку ў адносінах да сакавіка іх колькасць знізілася амаль у два разы.

Пандэмія каранавіруса змяніла стабільны курс рынку, які назіраўся ў пачатку года. Спатрэбіўся час, каб навучыцца жыць і працаваць у складаных эпідэміялагічных умовах. Часткова пандэмічныя страхі перамаглі дзякуючы аператыўнаму ўводу анлайн-сэрвісаў, відэа- і віртуальным турам па кватэрах. У ліпені рынак практычна аднавіўся да ўзроўню сакавіка. Аднак восень зноў унесла свае карэктывы. У верасні і кастрычніку актыўнасць на рынку ў параўнанні з сярэднестатыстычнымі штомесячнымі паказчыкамі знізілася ледзь ці не ў два разы.

На думку эксператаў, на падзенне попыту паўплываў адразу «клубок» фактараў: першая хваля пандэміі каранавіруса, палітычная і эканамічная нестабільнасць у грамадстве, а потым і наступленне другой хвалі пандэміі.

## Сітуацыя складаная, але прадаўцы не зніжаюць цэны

З апошніх негатыўных з'яў — поўнае прыпыненне крэдытавання куплі жылля на другасным рынку. Гэта падарвала фінансавыя магчымасці пакупнікоў. Цяпер на рынку іх мала, і даводзіцца вельмі актыўна таргавацца. Да таго ж здзелкі часта адкладаюцца з-за хваробы прадаўцоў і пакупнікоў.

Цяпер на продаж выстаўлена максімальная колькасць аб'ектаў нерухомасці. Але гэта не падштурхоўвае людзей да карэкціроўкі цэн. Нягледзячы на складаную эканамічную сітуацыю, прадаўцы ўсё роўна трымаюць цэннікі на ўзроўні мінулага года. Цяпер рынак застыў, у тым ліку і па гэтай прычыне.

Што датычыцца пакупнікоў, якія ўсё-такі прыходзяць на рынак, часцей за ўсё яны разглядаюць самыя танныя прапановы кватэр і набываюць іх у тым ліку з мэтай укласці грошы. На рынку ёсць здзелкі куплі-продажу і дарагіх кватэр, цэны на якія за апошнія месяцы знізіліся, і яны сталі прываблівыя для пакупнікоў. Але самы вялікі сегмент рынку — кватэры стандартных спажывецкіх якасцяў — па-ранейшаму набываюцца ў ланцужковым парадку.

Цяпер на рынку захоўваецца яшчэ адзін трэнд. Некаторыя банкі яшчэ крэдытуюць новабудоўлі па партнёрскіх праграмах з забудоўшчыкамі. Таму ёсць катэгорыя людзей, якія прадаюць свае старыя кватэры і наўзамен купляюць новыя з прыцягненнем крэдытных сродкаў. Гэта часткова ажыўляе рынак.

## З «чыстымі» грашыма прыходзіць усяго 10 % пакупнікоў

Сітуацыя на рынку ўскладняецца тым, што з пачатку жніўня патэнцыйныя пакупнікі з рэальнымі фінансамі занялі чакальную пазіцыю. На гэта паўплывала нявызначанасць і неразуменне таго, што будзе далей.

Людзі практычна не цікавіліся жыллём 2-3 месяцы, але ў лістападзе ў параўнанні з вераснем і кастрычнікам колькасць званкоў ад спажыўцоў павялічылася. Цяпер кліенты ўжо разумеюць, што крызісная сітуацыя зацягнецца і чакаць яе, мабыць, не варта. Сёння многія вырашаюць пытанне: купляць зараз ці перачакаць?

Мікалай Прасталупаў у гэтай сітуацыі адзначае, што, нягледзячы на багацце выстаўленых на продаж кватэр, цяпер выбраць прыдатны варыянт пакупнікам вельмі складана. Годных варыянтаў па суадносінах кошту і якасці на рынку вельмі мала. Яны калі і з'яўляюцца, то сыходзяць літаральна за лічаныя дні, ад сілы — тыдні.

Цяпер сітуацыя на рынку такая, што з «чыстымі» грашыма прыходзіць максімум 10 % ад агульнай колькасці пакупнікоў. Асноўная частка кліентаў — гэта прадаўцы, якія адначасова з'яўляюцца і пакупнікамі. А ім чакаць і спадзявацца на тое, што праз пару месяцаў яны купяць кватэру на 2—3 тысячы долараў танней, чым цяпер, не варта, таму што сваю кватэру яны таксама прададуць па больш нізкай цане.

Пакупнікі з «чыстымі» грашыма, вядома, могуць і не спяшацца. Але яны не робяць надвор'я на рынку. Гэта, як правіла, прадпрымальнікі, у якіх таксама знізіліся заробкі. На жаль, у існуючых умовах яны будуць выходзіць на рынак не так актыўна, як гэта было ў мінулыя гады, па меншай меры, да лета 2021 года, пакуль не наступіць поўная яснасць з каранавірусам, эканомікай і палітыкай, — дадае эксперт.



У астатнім мы можам толькі канстатаваць, што цяпер на рынку ёсць танныя варыянты кватэр і можна таргавацца. Магчыма, заўтра гэтыя кватэры будуць каштаваць яшчэ танней. Прагноз да зніжэння ёсць. Але ці ўдасца праз месяц-другі знайсці патрэбны варыянт — гэта яшчэ вялікае пытанне.

## Кошт метра не ўпадзе ніжэй за тысячу

Разглядаючы перспектывы другаснага рынку жылля на наступны год, Мікалай Прасталупаў адзначыў, што да красавіка тэндэнцыя на зніжэнне цэн захаваецца. Яны, як і цяпер, будуць падаць прыкладна ад аднаго да двух працэнтаў у месяц у рэальных здзелках. На думку нашага эксперта, ужо ў красавіку-маі на рынку пачнецца актывізацыя, а да лета рынак адновіцца і выйдзе на ўзровень 2019 года. З улікам адкладзенага попыту ёсць надзея, што сітуацыя будзе нават лепшая, чым летась.

Прыкладна такі ж (але трошкі іншы) даюць прагноз незалежныя аналітыкі. Яны адзначаюць, што з пачатку гэтага года цэны на кватэры стандартных спажывецкіх якасцяў ужо ўпалі прыкладна на 7—9 %. У найбліжэйшыя месяцы яны будуць працягваць зніжацца гэтак жа плаўна, як гэта адбываецца зараз, — прыкладна на 2 % у месяц. Па-ранейшаму будзе павялічвацца прапанова.

Калі сітуацыя з нявызначанасцю будзе працягвацца, то частка пакупнікоў не рызыкне купляць кватэры ў забудоўшчыкаў на стадыі катлавана. Ёсць вялікая верагоднасць, што будаўніцтва можа быць замарожана і дом ператворыцца ў даўгабуд. Хутчэй гэтыя пакупнікі прыйдуць на другасны рынак для таго, каб там набыць гатовае жыллё.

І яшчэ. Не заўсёды прагнозы спраўджваюцца. Многія чакалі абвалу цэн на нерухомасць яшчэ ў жніўні пасля вясновага рэзкага падзення кошту нафты і росту курсу долара па дачыненні да беларускага рубля. Але падзення цэн не адбылося ў тым аб'ёме, які варта было б чакаць. Казаць пра тое, што ў наступным годзе будзе глабальнае зніжэнне, напэўна, не варта. Яно працягнецца ў першым квартале 2021 года ў тэмпах апошняга квартала гэтага года. Далей загадваць вельмі складана з прычыны таго, што могуць з'явіцца новыя фактары, якія зменяць сітуацыю.

## Верасень стаў самым цяжкім месяцам для рыэлтараў

«Да лета сітуацыя на рынку нерухомасці стабілізавалася. Але ўжо ў жніўні пачалася другая хваля крызісу, звязаная з палітычнымі падзеямі ў Беларусі», — адзначае **старшыня Савета грамадскага аб'яднання «Беларуская асацыяцыя «Нерухомасць» Анатоль ЗВЕЗДЗІН.**

«У канцы жніўня было ўжо зразумела, што палітычныя падзеі, якія разгортваліся ў нашай краіне, вельмі моцна будуць уплываць на гэты рынак. У тым сэнсе, што спажыўцы ў гэты перыяд свае праблемы, звязаныя з жыллём, адсунулі на другі план. Плюс да гэтага прыйшла другая хваля каранавіруса. Сёння мы маем тое, што маем. Рынак у адносінах да летніх значэнняў зноў упаў на 30 %, калі казаць аб колькасці здзелак», — працягнуў Звездзін.

Самым крытычным перыядам для рыэлтараў стаў верасень. У гэты месяц колькасць здзелак дасягнула мінімуму за год. Разам з тым эксперт заявіў: не варта казаць пра тое, што крытычны пункт пройдзены. Не выключана, што рынак працягне падаць далей.

«Сапраўды, верасень быў самым цяжкім месяцам. У кастрычніку-лістападзе мы назіралі нейкае ажыўленне. Але яно не настолькі вялікае, каб гаварыць аб ім як аб трэндзе. Таму сцвярджаць, што рынак пойдзе ўверх, на мой погляд, заўчасна. Вялікая верагоднасць, што ён яшчэ будзе падаць», — рэзюмаваў эксперт.

Гаворачы аб цэнах на другаснае жыллё, ён паведаміў, што за год яны ўпалі недзе на 10 % — у сапраўдны момант квадратны метр у Мінску каштуе ў сярэднім 1350 долараў.

## Жыллё на другасным рынку ўпершыню стане таннейшым, чым новае

Некалькі асеў і рынак першаснага жылля. Аднак прычынай таму сталі не каранавірус і палітычныя падзеі, а спыненне крэдытавання будаўніцтва банкамі. Людзям не стала за што будавацца. «Найбольш сур'ёзны ўплыў на рынак першаснага жылля аказвае не столькі пандэмія або іншыя віды крызісу, якія сёння разгортваюцца ў краіне, а іх наступствы. Прычым асноўным наступствам з'яўляецца «згортванне» крэдытных праграм. Сёння я назваў бы гэта самым галоўным фактарам», — падкрэсліў **член Асацыяцыі забудоўшчыкаў аб'ектаў жыллёвага будаўніцтва Беларусі і «Беларускай асацыяцыі «Нерухомасць» Юрый ЖАРКОЎ.** Эксперт выказаў здагадку, што калі б крэдытныя праграмы працягнулі існаваць у тым выглядзе, у якім яны былі хоць бы летась, падзення рынку не здарылася б, нягледзячы на розныя падзеі.

Цэны на першаснае жыллё за бягучы год упалі на 10—15 %. Эксперт лічыць, што на гэтым падзенне не скончыцца. У той час як кошты на «другасным рынку» працягнуць зніжэнне. Рыэлтары лічаць, што ў 2021 годзе адбудзецца гістарычная падзея: жыллё на другасным рынку ўпершыню за доўгі час стане таннейшым, чым на першасным.

«Традыцыйна ў нас было наадварот. Цэны першаснага рынку былі, як правіла, ніжэйшыя», — адзначыў **старшыня праўлення Канфедэрацыі агенцтваў нерухомасці Павел АСТАПЕНЯ.** Ён растлумачыў, што такая тэндэнцыя адбудзецца з-за таго, што забудоўшчыкі, укладваючы свае сродкі ў будаўніцтва новага жылля, будуць не гатовыя скідаць цэны на «пярвічныя» кватэры.

Паводле яго слоў, зніжэнне цэн другаснага жылля працягнецца аж да вясны 2021 года. За бягучы год кватэры не сталі значна таннейшымі. Да вясны 2021 года цэны ўпадуць прыкладна яшчэ на 15 %, лічыць Астапеня.

## Арэнднае жыллё

У сярэднім на 10—15 % сталі таннейшымі кватэры ў Мінску, якія здаюцца ў арэнду. На думку рыэлтараў, у прыватнасці, гэта было выклікана зніжэннем узроўню жыцця насельніцтва і згортваннем турызму. Попыт на арэнднае жыллё скараціўся, пры гэтым рынак цяпер досыць насычаны. Разам з тым далёка не ўсе ўладальнікі кватэр гатовыя да зніжэння цэн.

«Гэтую восень мы сустрэлі без выбуховага ажыятажу на рынку арэнды жылля. Я магу сказаць, што цэны на такое жыллё ўпалі на 15 % і яшчэ на 15 % знізяцца да вясны 2021 года», — адзначыў Павел Астапеня. «Так, сапраўды ў нас сёння ёсць людзі, якія не чуюць тэндэнцыю, не чуюць нашы экспертныя ацэнкі. Яны або стаяць на сваім, або сыходзяць са словамі: «Я пачакаю лепшых часоў», — дадаў Анатоль Звездзін.

## У рэгіёнах тэндэнцыя «адкрываецца» пазней

Падзенне рынку нерухомасці назіраецца не толькі ў сталіцы, але і ў іншых беларускіх гарадах. Па словах аднаго з гомельскіх рыэлтараў, сярэдняя колькасць здзелак у яго скарацілася на 50—60 % за бягучы год.

«Калі казаць пра пандэмію, то Мінск яе ўплыў адчуў у сакавіку. Мы, як больш інертныя, атрымалі падзенне цэн у красавіку», — паведаміў аб сітуацыі ў Гомелі **намеснік старшыні Савета грамадскага аб'яднання «Беларуская асацыяцыя «Нерухомасць» Алег ВАЛЬШТЭЙН.**

Але ў рэгіёнах далёка не ўсе прадаўцы нерухомасці вераць у крызіс. Як вынік — адмаўляюцца зніжаць цэны. У сваю чаргу ў пакупнікоў стала значна менш магчымасцяў (з-за адсутнасці крэдытавання), за кошт чаго і адбываецца скарачэнне колькасці здзелак.

Што датычыцца апошніх санкцый ЕС у дачыненні да Беларусі, то, на думку экспертаў, наша краіна ў розныя гады ўжо знаходзілася пад санкцыямі. Таксама былі перыяды, калі адбывалася прыпыненне банкаўскага крэдытавання. Тым не менш здзелкі куплі-продажу не спыніліся...

Сяргей КУРКАЧ.

# НАВАГОДНЯЯ АТМАСФЕРА БЕЛАРУСКАЙ ПОШТЫ



Крыху больш за два тыдні засталося да таго, як 2020-ы год сыдзе ў гісторыю. Таму беларуская пошта ўжо традыцыйна рыхтуецца да навагодніх свят. Рубеж снежня адыходзячага года і студзеня надыходзячага — для паштавікоў заўжды час напружанай работы. Гэта і нядзіўна, бо шмат людзей жадаюць даслаць напісаную ад рукі паштоўку сваім блізкім, родным і знаёмым. А пошта дапаможа выбраць патрэбны фармат і даставіць каштоўнае для чалавечага сэрца адпраўленне.

— У беларускай пошты ёсць выдатная традыцыя: штогод распрацоўваць да навагодніх і калядных свят калекцыі мастацкіх марак, паштовак і картак, канвертаў і паштовых набораў, — паведамілі ў прэс-службе РУП «Белпошта».

Так, сёлета яшчэ ў канцы кастрычніка былі аддрукаваны спецыяльны набор мастацкіх марак «З Новым годам і Калядамі!». На іх змешчана выява Дзеда Мароза на фоне галоўнага навагодняга атрыбута — ёлкі — і анёл, які ляціць над зямлёй і абвяшчае навіну пра Раство Хрыстова. Маркі аддрукаваны тыражом у 30 тысяч экзэмпляраў кожная. Яны таксама выйшлі і ў малым лісце. Кожны такі ліст (а іх выйшла з тыпаграфіі сем тысяч) змяшчае ў сабе чатыры маркі. Намінал адпавядае тарыфу на перасылку простага ліста масай да 20 грамаў у межах Беларусі.

— Таксама ўпершыню па сюжэтах паштовых марак зроблены спецыяльныя магніты навагодняй і калядная тэматыкі, — адзначылі ў прэс-службе. — Два магніты пры гэтым можна «ажывіць» пры дапамозе бясплатнай мабільнай праграмы AR MARKA BELARUS.

Добрая навіна і для пасткросераў. Яны змогуць адправіць сваім сябрам у краіны замежжа паштовыя карткі навагодняй гумарыстычнай тэматыкі.

— Данесці сваю любоў і ўвагу блізкім і дарагім людзям напярэдадні светлага свята Божага Нараджэння і Новага года — лёгка: трэба прыйсці ў «Паштовы салон», які месціцца ў будынку Галоўпаштамта, выбраць прыгожую паштоўку і канверт, напісаць добрыя, трапяткія словы, а беларуская пошта своечасова даставіць ваша пасланне! — расказалі ў прэс-службе прадпрыемства. — Дарэчы, у «Паштовым салоне» працуе адмысловая навагодняя фотазона.

## ЛІСТ ДЗЕДУ МАРОЗУ

Акрамя таго, да 22 снежня дзякуючы пошце можна замовіць віншаванне ад Дзеда Мароза. Зрабіць гэта можна, абраўшы адзін з двух варыянтаў. Першы — гэта ліст ад навагодняга чараўніка. Ён прыйдзе ў арыгінальным канверце. А ў ім адрасат знойдзе святочную паштоўку. Ды яшчэ якую — незвычайную! Пасланне ў ёй будзе аформлена пры дапамозе дапоўненай рэальнасці. Таксама ад Дзеда Мароза можна атрымаць і мяккую цацку-падушку. Памерам яна невялікая — усяго 30 на 30 сантыметраў. Але на ёй будзе выява сімвала года — Белага Металічнага Быка. Падушка таксама змяшчае пасланне ў фармаце дапоўненай рэальнасці. Такі незвычайны падарунак можна атрымаць з 26 да 31 снежня. Паштальён прынясе яго ў дом.

Да таго ж сёлета ў буйных аддзяленнях паштовай сувязі ўстаноўлены спецыяльныя скрыні, куды можна апусціць ліст са сваімі пажаданнямі і марамі. Яго даставяць непасрэдна Дзеду Марозу і Снягурцы. Але навагодняе пасланне можна адправіць і звычайным спосабам з любога аддзялення паштовай сувязі. Усё, што трэба, гэта правільна ўказаць адрас: *225063, рэзідэнцыя Дзеда Мароза ў Белавежскай пушчы (вёска Каменюкі, Брэсцкая вобласць).*

Але варта паспяшацца з адпраўленнем ліста ўжо цяпер. Справа ў тым, што калі ў канцы снежня Дзеду Марозу адначасова даставяць некалькі мяшкоў лістоў, то прачытаць іх усе своечасова ён не зможа.

**Валяр'ян ШКЛЕННІК.**
**Фота дадзены РУП «Белпошта».**







# Службовы гаджэт напагатове

### Гродзенская вобласць стала другім у краіне рэгіёнам, куды прыйшоў «Мабільны паштальён»

**Сацыяльны праект «Белпошта» распачала год таму. Яго сутнасць у тым, каб забяспечыць паштальёнаў спецыяльна распрацаванымі мабільнымі прыладамі. Першымі ў рэгіёне іх пачалі асвойваць лідчане. У раёне ўсе паштальёны забяспечаны апаратам, які з дапамогай дадатка дазваляе ў рэжыме анлайн ажыццяўляць прыём усіх плацяжоў і паслуг, што прапануюцца на аб'екце паштовай сувязі.**

Першымі апрабавалі новаўвядзенне кіроўцы-паштальёны. Водгукі аб рабоце станоўчыя — працаваць зручней і прасцей, чым з бланкамі і папяровай справаздачнай дакументацыяй. Такі вердыкт вынеслі ў Лідскім рэгіянальным вузле паштовай сувязі. Па словах **начальніка РВПС Яўгена СЕРПУКА**, «мабільнага паштальёна» асабліва ацанілі там, дзе няма паштовых аддзяленняў і банкаў. Гэта аддаленыя вёскі, дзе, бывае, пражывае і да некалькіх дзясяткаў жыхароў.

— У паштальёна на руках прылада, якая дазваляе аказаць поўны пералік тых паслуг, што кліент можа атрымаць на аб'екце паштовай сувязі. У тым ліку прыём падпіскі, выдачу пенсіі, прыём і выплату пераводаў, прыём і выдачу паштовых адпраўленняў, рэалізацыю тавараў штодзённага попыту на даставачным участку паштальёна, — зазначыў Яўген Сярпук.

На базе аперацыйнай сістэмы Android устаноўлены спецыяльны дадатак, які дазваляе праводзіць усе неабходныя маніпуляцыі. Праграму нельга прыстасаваць для звычайнага смартфона, а толькі пад пэўны апарат для службовага карыстання.




У Гродзенскім філіяле РУП «Белпошта» паведамілі, што на эксперымент у Лідскі раён накіравана 88 апаратаў, якімі забяспечаны ўсе паштальёны вузла. Дыяпазон абслугоўвання даволі значны. Сюды ўваходзіць Лідскі, Воранаўскі, Іўеўскі і Дзятлаўскі раёны.

Па словах **дырэктара Гродзенскага філіяла Андрэя АНІСІМАВА**, «мабільны паштальён» добра зарэкамендаваў сябе ва ўсх відах паслуг. Ёсць магчымасць разлічвацца як наяўнымі сродкамі, так і праз банкаўскія пластыкавыя карткі. Пры аказанні паслугі апарат выдае чэк, які кліент атрымлівае пры любых разліках. Да таго ж усе аперацыі праходзяць у рэжыме анлайн.

Пасля таго, як першымі ў гэты працэс уключыліся кіроўцы-паштальёны, гэтая мабільная прылада распаўсюджана сярод усіх паштальёнаў.

Зараз на Лідскім раённым вузле завяршаецца навучанне супрацоўнікаў і ўкараненне апошніх адзінак «мабільнага паштальёна». У асноўным усе апараты на руках, і паштальёны імі з задавальненнем карыстаюцца. Засвоіць яго нескладана, а вось плюсоў у рабоце ён дадае нямала, паведамілі ў Лідзе. Раней квітанцыі на такія паслугі даводзілася выпісваць ад рукі. На кожную аперацыю — асобная квітанцыя. Паштальёну ў канцы працоўнага дня такую справаздачу трэба было аформіць у аддзяленні сувязі. Зараз усе паслугі праводзяцца праз мабільную прыладу з касавым апаратам і тэрміналам для аплаты банкаўскай карткай. Некалькі «клікаў» — і кліент атрымлівае звычайны чэк. Усе аперацыі праводзяцца ў рэжыме анлайн і адразу паступаюць у базу даных «Белпошты», а грошы, якія прыняты ад кліента, — на разлік. Зручна, бо абслугоўванне хуткае.

Лідскі раён невыпадкова стаў першым у новаўвядзенні. Гэта адбылося таму, што Ліда ўвайшла ў спіс гарадоў з паскораным развіццём. Як бачым, у гэты працэс актыўна ўключыўся і паштовы сэрвіс.

— Гродзенская вобласць — другі рэгіён эксперыментальнага праекта. Год таму пілотны праект быў запушчаны ў Аршанскім раёне. Па словах нашых калег, паслуга хутка прыжылася. Практыка паказала, што эксперымент сябе поўнасцю апраўдаў, хоць укараняўся паступова і меў абмежаваны комплекс паслуг, — патлумачыў Андрэй Анісімаў.

Не ўсе паслугі паштовай сувязі напачатку былі даступны для кліента. На першым этапе з дапамогай «мабільнага паштальёна» афармлялася падпіска, можна было здзейсніць камунальныя плацяжы ў сістэме АРІП (Адзіная разліковая інфармацыйная прасторы). Праз некаторы час дабавілася магчымасць пакупкі тавараў і адпраўкі паштовых адпраўленняў. Трэці этап дазволіў афармляць унутраныя і міжнародныя паштовыя пераводы, прыём і выплату паштовых грашовых пераводаў, выплату пенсій. Гродзенцы ўключыліся ў праект адразу з усімі гэтымі функцыямі.

Зараз у структуры «Белпошты» больш за тры тысячы аддзяленняў сувязі, асноўная колькасць знаходзіцца ў сельскай мясцовасці. Паштальёна ў вёсках чакаюць. Калі раней функцыі яго былі абмежаваны — прынесці паштовыя адпраўленні, выпісаць газету ці часопіс, прынесці пенсію, — то цяпер колькасць паслуг значна пашырылася. Вяскоўцы з задавальненнем карыстаюцца новай паслугай. Сярод папулярных — папаўненне балансу мабільнай сувязі, аплата камунальных паслуг. Зараз вядзецца падпіска перыядычных выданняў. У сувязі з гэтым паштальёны робяць падамавы і пакватэрны абход. Такім чынам, жыхарам не трэба нават выходзіць на вуліцу, каб выпісаць газету або часопіс.

**Маргарыта УШКЕВІЧ.**
**Фота дадзена Гродзенскім філіялам РУП «Белпошта».**

# МЯСЦОВАЕ САМАКІРАВАННЕ

18 снежня 2020 г. № 48 (584)

Штотыднёвы дадатак газеты ЗВЯЗДА

ГАЗЕТА ДЛЯ ВЫБАРШЧЫКАЎ І ДЭПУТАТАЎ МЯСЦОВЫХ САВЕТАЎ


ФОРУМ



Фота БелТА.

# ШЧЫРАЯ РАЗМОВА

## Старшыня Савета Рэспублікі Наталля КАЧАНАВА сустрэлася з удзельнікамі VIII Беларуска-расійскага маладзёжнага форума

**На думку спікера верхняй палаты парламента, форум дазволіў выпрацаваць новыя падыходы, разгледзець тыя пытанні, якія сёння найбольш актуальныя для моладзі Беларусі і Расіі.**

Размова адбылася ў рэжыме адкрытага дыялогу. Асноўную частку адведзенага на сустрэчу часу склалі адказы старшыні Савета Рэспублікі на пытанні юнакоў і дзяўчат з зала. У выніку абмеркавалі даволі шырокае кола пытанняў, выслухалі аўтараў ініцыятыў і прапаноў, што датычыліся рэалізацыі актуальных сацыяльных праектаў, прагучалі новыя ідэі.

### Не здрадзіць памяці пераможцаў

Форум адбыўся ў год 75-годдзя Вялікай Перамогі, і тэма захавання аб'ектыўнай гістарычнай памяці пра гераічны подзвіг савецкага народа ў Вялікай Айчыннай вайне, натуральна, узнікла падчас дыялогу.

Наталля Качанава падкрэсліла неабходнасць захаваць памяць пра людзей, якія адстаялі мір і свабоду на нашай зямлі, памяць аб падзеях страшных ваенных гадоў. Яе зацікавіў сціслы аповед прадстаўніцы расійскага саюза сельскай моладзі пра акцыю «Подзвіг вёскі». Яе мэта — расказаць аб гераізме вясковых жыхароў Расіі ў аднаўленні разбуранай ушчэнт вёскі ў гады вайны. Маладыя людзі ўжо запісалі і сабралі больш за восем тысяч гісторый на гэтую тэму, правялі вялікую фотавыстаўку ў Савеце Фэдэрацыі Расіі. Адсюль і прапанова: распаўсюдзіць такі вопыт і ў Беларусі.

Наталля Качанава падтрымала ідэю. Паводле яе слоў, мы не маем права здрадзіць гэтай памяці, яе трэба перадаваць ад пакалення да пакалення і разам змагацца супраць гераізацыі фашызму. Гэта наш абавязак. Бо самае галоўнае ў свеце — мір. У Вялікай Перамозе тыя гістарычныя карані, якія аб'ядноўваюць нашыя народы. І гэтая гістарычная памяць павінна назаўсёды застацца ў сэрцах.

### Валанцёрскі рух — пачэсны

Цікавая прапанова прагучала з вуснаў расіянкі Лейлы: стварыць дыялогавую пляцоўку для беларускіх і расійскіх маладых валанцёраў з мэтай сумеснай рэалізацыі карысных для людзей праектаў у абедзвюх краінах.

Наталля Качанава падтрымала ініцыятыву і паабяцала ўдзельнічаць у дыялогавых пляцоўках, куды запросіць моладзь.

Сёння, калі нашыя краіны, ды і ўвесь свет, сутыкнуліся з каранавірусам, валанцёрскі рух — гэта архіважна. У зоне ўвагі маладых валанцёраў шмат людзей сталага ўзросту, інвалідаў. Хлопцы і дзяўчаты прыносяць ім лекі з аптэкі, прадукты харчавання з магазіна, іншыя спажывецкія тавары. І чым больш будзе такіх ініцыятыў, тым лепш.

### Быць патрыётам у першую чаргу

Малады хлопец Яўген з Гродзенскай вобласці пытаўся пра асаблівасці ажыццяўлення маладзёжнай палітыкі ў нашай краіне на сённяшнім этапе, пра актуальнасць супрацьдзеяння негатыўнай ролі сацыяльных сетак у фарміраванні матывацыі паводзін маладых людзей.

Спікер верхняй палаты парламента падкрэсліла, што маладзёжная палітыка — прыярытэтны кірунак дзяржаўнай палітыкі. І самае галоўнае тут — патрыятызм: любоў да радзімы, краіны, сям'і, родных і блізкіх — тых людзей, якія побач. І сёння малады чалавек павінен быць у першую чаргу патрыётам.

На шматлікіх прыкладах Наталля Качанава паказала, як дзяржава, у сваю чаргу, імкнецца ўсяляк дапамагаць маладым у іх вялікіх і малых справах: праявдзенні патрыятычных акцый, актывізацыі дзейнасці інстытута куратарства для хуткага прафесійнага станаўлення маладых спецыялістаў, рэалізацыі спартыўных мерапрыемстваў і гэтак далей.

**Старшыня Рэспубліканскага саюза грамадскіх аб'яднанняў «Беларускі камітэт маладзёжных арганізацый» Павел АЛЕКСА** адзначыў як знакавы для ўдзельнікаў сустрэчы ў Мінску той факт, што форум завяршыўся важным мерапрыемствам: шчырай размовай са старшынёй Савета Рэспублікі.

— Гэта ў чарговы раз дэманструе, што дзяржава аддае вялікую ўвагу маладзёжнай палітыцы, — падкрэсліў ён.

Нагадаем, наступны форум пройдзе ва Уладзівастоку — самым усходнім пункце Саюзнай дзяржавы.

**Леанід ТУГАРЫН.**

У ЦЭНТРЫ ЎВАГІ

# Падаражання быць не павінна, або Які «індэкс аліўе»?

## Сенатары праманіторацць цэны ў крамах на прадукты да святочнага стала

**Рабочую нараду з удзелам усіх зацікаўленых бакоў днямі правяла старшыня Пастаяннай камісіі па эканоміцы, бюджэце і фінансах Таццяна РУНЕЦ. У цэнтры ўвагі ўдзельнікаў была тэма вывучэння росту цэн на прадукты харчавання, да якой далучыліся сенатары.**

На сустрэчы ў Савеце Рэспублікі ўдзельнічалі прадстаўнікі Міністэрства антыманапольнага рэгулявання і гандлю, Белстата і Федэрацыі прафсаюзаў — тых структур, якія пастаянна кантралююць змены цэн на спажывецкім рынку і аналізуюць гэты працэс. Дарэчы, МАРГ яшчэ і выступае рэгулятарам гэтага працэсу, калі назіраюцца пэўныя змены не толькі ў бок павелічэння, а і ў бок зніжэння цэн (такое таксама здараецца).

Як адзначыла старшыня профільнай камісіі Таццяна Рунец, цэны тавараў — адна з тэм, якая хвалюе насельніцтва. Таму Савет Рэспублікі ўдзельнічае ў маніторынгу цэн, бо гэта адна з трыадзіных задач у ланцужку «цэны—занятасць—зарплата», якую паставіў кіраўнік дзяржавы, і ўзаемадзеянне ў адзінай звязцы ўсіх дзяржаўных органаў па яе выкананні знаходзіцца ў цэнтры ўвагі сенатарскага корпуса. У прыватнасці, як звычайныя спажыўцы мы заўважаем змены ў цэнніках на сланечнікавы алей, грэчку, цукар і іншыя базавыя прадукты.

Па словах сенатара, вынікі маніторынгу накіроўваюцца ў Міністэрства антыманапольнага рэгулявання і гандлю, і калі ёсць парушэнні, там аператыўна прымаюць адпаведныя меры. Напрыклад, як растлумачыла Таццяна Рунец, такім чынам былі адрэгуляваны цэны на крупы ў некаторых рэгіёнах краіны. Трэба сказаць, што масавых злоўжыванняў у гандлёвых аб'ектах зарэгістравана не было.

### Увага да навагодняга стала

Аднак напярэдадні Новага года важна звяртаць увагу на цэнавыя змены ў наборы прадуктаў для навагодняга стала, якія не ўваходзяць у спіс сацыяльна значных тавараў, як, напрыклад, хлеб ці малако. Але, пагадзіцеся, пераплачваць за бутэльку шампанскага ці мандарыны не хоча ніхто. Таму Міністэрства антыманапольнага рэгулявання і гандлю, сенатарскі корпус і іншыя зацікаўленыя ў гэты перыяд пачнуць аддаваць больш увагі маніторынгу цэн на традыцыйныя прадукты, якія выкарыстоўваюцца для прыгатавання святочных страў, і розныя напоі.

— Што датычыцца перадвнавагодняга маніторынгу, яго мы традыцыйна ўзмацняем і вядзём не на штотыднёвай, а на штодзённай аснове. Глядзім цэны на пазіцыі, якія звычайна ёсць на навагоднім стале, і аператыўна адпрацоўваем парушэнні гандлю, вытворцаў і перапрацоўшчыка, — растлумачыў журналістам **намеснік міністра антыманапольнага рэгулявання і гандлю Андрэй КАРТУН.**

Адказваючы на пытанне карэспандэнта «МС» адносна «індэкса аліўе», ён расказаў, што ў спіс для перадвнавагодняга маніторынгу трапляюць 25-30 пазіцый. Традыцыйна гэта зялёны гарошак, мандарыны, некаторыя віды цукерак, шакалад, шампанскае. Напрыклад, цэны на мандарыны шмат у чым абумоўлены сёлетнім ураджаем.

**(Заканчэнне на 18-й стар.)**

БЛІЗКАЯ ЎЛАДА

# ЯКІЯ ПРАПАНОВЫ?

## Аказанне платных сацыяльных паслуг пенсіянерам і нестандартнае асваенне «сямейнага капіталу»...

**Прыём у грамадскай прыёмнай Гомельскага аблвыканкама правёў член Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па міжнародных справах і нацыянальнай бяспецы, начальнік Гомельскай мытні Фелікс ЯШКОЎ.**

Да сенатара звярнулася гамяльчанка Таццяна Зінкевіч. Шматдзетная маці распавяла, што некалькі гадоў таму яе сям'я атрымала кватэру, за якую было неабходна даплаціць 10 тысяч долараў. Але здарылася бяда: муж стаў інвалідам. Цяпер уся яго пенсія ідзе на пагашэнне доўгу. Сродкаў для таго, каб прывесці новую кватэру ў належны стан, няма, а таму шэсць чалавек вымушаны жыць у аднапакаёўцы. Сітуацыю шматдзетная сям'я магла б выправіць праз выкарыстанне «сямейнага капіталу». Праўда, адпаведным законам такое нямэтавае асваенне сродкаў не прадугледжана.



На яшчэ адну акалічнасць выкарыстання заканадаўства звярнула ўвагу гамяльчанка Лілія Поз. Яна растлумачыла, што сёлета давялося знаходзіцца ў адной з бальніц сястрынскага догляду. Для аплаты аказаных паслуг пацыенты пералічваюць 80 % пенсіі. Па словах жанчыны, праблема ў тым, што пенсіі ў людзей з вялікім працоўным стажам і тых, хто практычна ніколі не працаваў, розныя. Як вынік адны і тыя ж паслугі камусьці каштуюць 500 рублёў, а камусьці 150. На думку Ліліі Поз, у сацыяльным плане гэта несправядліва.

Жыхар Гомельшчыны Анатоль Чарняк патэлефанаваў на прамую лінію, каб узняць пытанне выплаты пенсіі. Ён упэўнены, што на прадпрыемстве, дзе працаваў усё жыццё, не плацяць за адпрацаваны час, не пералічваюцца грошы ў пенсійны фонд і не выдаюць даведку аб сярэднім заробку. У адказ начальнік Гомельскай мытні падкрэсліў, што Беларусь займае лідзіруючае месца па абароне правоў і сацыяльнай падтрымцы грамадзян і агучанае пытанне не будзе пакінута без увагі.

Асабісты прыём і прамая тэлефонная лінія сенатара ў Гомельскім аблвыканкаме працягвалася дзве гадзіны. За гэты час Фелікс Яшкоў выслухаў ад жыхароў рэгіёна прапановы аб шляхах узмацнення розных галін улады, неабходнасці пераглядy памераў пенсій для інвалідаў III групы. Выказвалася думка гараджан аб больш грунтоўнай адказнасці ўласнікаў жылля за здадзеныя на суткі кватэры. Пасля заканчэння работы грамадскай прыёмнай сенатар звярнуў увагу на важнасць вывучэння грамадскай думкі праз работу ў грамадскіх прыёмных. Усе прынятыя ім звароты застануцца на кантролі члена Савета Рэспублікі.

**Наталля КАПРЫЛЕНКА,**
**Фота БелТА.**

ПА СУТНАСЦІ СПРАВЫ

**Ігар ЖУК:**

# «У мясцовай улады павінен быць фонд для рэалізацыі грамадзянскіх ініцыятыў»

**Такой эксперыментальнай пляцоўкай можа стаць Гродзенскі рэгіён. Пілотны праект па фарміраванні бюджэту грамадзянскага ўдзелу скіраваны на павышэнне ролі мясцовага самакіравання. Прапанова будзе прадстаўлена ад рэгіёна на Усебеларускім сходзе. Аб тым, як узмацніць аўтарытэт органаў мясцовага кіравання, разважае старшыня Гродзенскага абласнога Савета дэпутатаў Ігар ЖУК.**



sovrep.gov.by

***— Ігар Георгіевіч, адна з дыялогавых пляцовак, што прайшла ў Гродне, датычылася ролі мясцовага самакіравання. Якое ўражанне яна пакінула?***

— У дыялогавай пляцоўцы ўзялі ўдзел дэпутаты ўсіх узроўняў, прадстаўнікі грамадскіх арганізацый, прафсаюзы, грамадскія актывісты. Прапановы будуць прадстаўлены ад рэгіёна на Усебеларускі сход для абмеркавання. Парадавала, што ўсе, хто ўдзельнічаў, неабыякавы да лёсу краіны. Шмат было выказана пажаданняў у адрас дэпутацкага корпуса ад грамадзянскай супольнасці. Была прапанова больш актыўна праяўляць сваю пазіцыю, сустракацца са сваімі выбаршчыкамі, каб усе праблемныя пытанні вырашаліся не на вуліцах і плошчах, а за сталом у фармаце дыялогу.

Лічу, што мы павінны пачуць людзей. Іншы раз яны выступаюць у якасці нашых апанентаў, але і сярод іх ёсць канструктыўныя прапановы па ўдасканаленні заканадаўства, рабоце сістэмы дзяржкіравання, рэфармаванні галін эканомікі. Мы павінны гэта пачуць, прааналізаваць, і, калі гэта заслугоўвае ўвагі, прыкласці намаганні для рэалізацыі.

***— Падчас дыялогавай пляцоўкі неаднойчы гучала прапанова аб пашырэнні паўнамоцтваў мясцовай улады. Якія да гэтага ёсць шляхі?***

— Адзін з іх — сфарміраваць у рэгіёне бюджэт грамадзянскага ўдзелу для рэалізацыі праектаў на мясцовым узроўні. Гэта сусветны вопыт. З такой прапановай мы выступаем даўно, і мы будзем адстойваць гэтую пазіцыю. У чым сутнасць? Частку бюджэту базавага ўзроўню, а гэта невялікая доля — ад 0,1 да 0,5 % агульнага бюджэту, — накіраваць у фонд, у размеркаванні якога бярэ ўдзел насельніцтва канкрэтнага раёна.

***— На якія мэты маглі б пайсці гэтыя сродкі?***

— Яны будуць выдзяляцца пераможцам конкурсу ініцыятыў, праектаў, якія паступаюць ад грамадзян ці ад грамадскіх арганізацый. Гэта, як правіла, сацыяльныя праекты, скіраваныя на паляпшэнне інфраструктуры пражывання, паляпшэнне экалагічнай сітуацыі. Напрыклад, азеляненне, стварэнне спартыўных пляцовак, пляцовак для выгулу сабак, веладарожак — таго, што хвалюе жыхароў. Камісія адбірае найлепшы праект, і ён фінансуецца з гэтага фонду. Тут важныя два моманты. Людзі больш цэняць тое, што зроблена непасрэдна на іх падаткі і для іх. Другое — людзі бачаць, што ўлада іх пачула, іх прапановы рэалізаваны.

***— Як хутка можа запрацаваць такі фонд?***

— Я думаю, гэта рэальна. Мы з Міністэрствам фінансаў зараз адпрацоўваем канкрэтныя механізмы ўкаранення фонду грамадзянскага ўдзелу. Магчыма, Гродзенская вобласць стане пляцоўкай для рэалізацыі пілотнага праекта.

***— Ці варта ствараць такі фонд на рэспубліканскім узроўні?***

— Фонд грамадзянскага ўдзелу фарміруецца на ўзроўні раёна. І потым насельніцтва ўдзельнічае ў праектнай дзейнасці. А вось на ўзроўні краіны мы прапануем ствараць фонд падтрымкі мясцовых ініцыятыў, калі ў праекце будзе ўдзельнічаць населены пункт або цэлы раён. Вопыт Гродзеншчыны ў праектах міжнароднай тэхнічнай дапамогі і іншых ініцыятывах паказаў, што вынік ад такой дзейнасці ўмацоўвае пазіцыі мясцовага самакіравання. Калі старшыня сельскага Савета, напрыклад, выйграе такі міжнародны праект, прыносіць у выканкам 10 тысяч долараў, што зусім нядрэнна. Ад гэтага аўтарытэт старшыні сельвыканкама толькі расце, бо ён не ўзяў грошы з бюджэту, а знайшоў іх у іншай крыніцы. Гэта сусветная практыка — пошук пазабюджэтных сродкаў. Чаму б і нам на ўзроўні краіны не ствараць такі фонд падтрымкі ініцыятыў? Гэта павысіць зацікаўленасць органаў мясцовай улады і дазволіць прыцягнуць людзей непасрэдна да ўдзелу ў размеркаванні сродкаў, што накіруе іх у канструктыўнае рэчышча.

***— Што робіцца зараз, каб людзі адчувалі зацікаўленасць у сваіх ідэях з боку ўлады?***

— Прапановы, якія паступаюць у адрас улады, аналізуюцца, і на іх аснове выбудоўваецца бюджэт наступнага года. Акрамя таго, сюды ўваходзіць і фінансаванне 20 дзяржаўных рэгіянальных праграм.

Мы не дзелім бюджэт за закрытымі дзвярыма. Гэта адкрытая старонка. На інтэрнэт-сайтах у нас размешчаны праект бюджэту для абмеркавання. Увогуле інфармацыя даступная. Але мы пойдзем далей і цяпер будзем больш дэтальна інфармаваць аб расходнай частцы. Папулярна расказваць, як і колькі сродкаў пойдзе ў тую ці іншую сферу. Практыка паказала, што такая інфармацыя вельмі важная для падаткаплацельшчыкаў.

***— Для ўмацавання ролі мясцовага самакіравання важна мець фінансы, каб больш сродкаў акумулявалася ў рэгіёнах. Ці можна дабіцца дэцэнтралізацыі фінансаў на карысць рэгіёнаў?***

— Зразумела, мы як рэгіён павінны ўдзельнічаць у фарміраванні рэспубліканскага бюджэту. Бо менавіта адтуль атрымліваем дарагое абсталяванне, напрыклад, у медыцыне і іншых галінах. Разам з тым мы за тое, каб павялічыць адлічэнні ад тых падаткаў, якія ідуць у рэспубліканскі бюджэт, больш пакінуць на месцах, змяніць прапорцыю. Тым самым знізіць датацыйнасць рэгіёна. Гродзенская вобласць атрымлівае 22—24 % датацый з рэспубліканскага бюджэту. Таму гэта тэма будзе абмяркоўвацца з Міністэрствам фінансаў і Міністэрствам эканомікі.

***— Цяпер ідзе актыўнае абмеркаванне мадэлі новай Канстытуцыі, дзе прапануецца пераразмеркаваць паўнамоцтвы паміж галінамі ўлады. Як вы лічыце, дэцэнтралізацыя ўлады павысіць ролю мясцовага самакіравання? Ці гатовы дэпутаты ўзяць на сябе такія паўнамоцтвы?***

— Ад гэтага працэсу мы нікуды не адыдзем. Дэцэнтралізацыя сапраўды прыспела. У нас за гады суверэннай Беларусі створана магутная вертыкаль улады, якая дазволіла вывесці краіну з крызісу, пабудаваць моцную дзяржаву. Цяпер частку паўнамоцтваў Прэзідэнта і ўрада можна перадаць парламенту і мясцовым органам улады. Але, як сказаў Прэзідэнт, перадача паўнамоцтваў — гэта і перадача адказнасці. Тым не менш многія дэпутаты — людзі прафесійна падрыхтаваныя. Сярод іх — кіраўнікі прадпрыемстваў, навукоўцы, прадстаўнікі бізнесу. Гэта кампетэнтныя людзі, яны могуць вырашаць задачы, якія будуць стаяць перад рэгіёнам. І, мне здаецца, іх не трэба баяцца.

***— Сапраўды, сярод дэпутатаў значную долю складаюць кіраўнікі рознага ўзроўню. Ці будзе гэта спрыяць актыўнасці звычайных грамадзян у вырашэнні мясцовых пытанняў?***

— Тое, што выбіралі кіраўнікоў, сведчыць аб тым, што яны вядомыя людзі. Многія бачаць, напрыклад, у СМІ, як пэўны кіраўнік спраўляецца з работай прадпрыемства, і спадзяюцца на яго і як на дэпутата. Разам з тым мы не зачыняем дзверы і перад іншымі людзьмі, хто неабыякавы да жыцця свайго населенага пункта. Хто хоча на грамадскіх пачатках паўдзельнічаць у жыцці краіны, можа гэта зрабіць, нягледзячы на пасаду. Наступныя выбары ў мясцовыя Саветы павінны адбыцца ў пачатку 2022 года. Гэта будуць ужо выбары іншага фармату. Канкурэнцыя за месца стане значна вышэйшая.

***— Колькасць дэпутатаў захаваецца на такім жа ўзроўні?***

— Такое вызначаецца нормамі заканадаўства ў залежнасці ад колькасці насельніцтва. На мінулых выбарах у нас было абрана 2389 дэпутатаў.

***— Апошнім часам выказваецца прапанова ліквідаваць такое звяно, як дэпутаты сельскіх Саветаў. Дарэчы, нядаўна падобнае меркаванне было выказана ў «Звяздзе» менавіта самой дэпутаткай. Маўляў, хопіць і раённага звяна...***

— Такое пытанне абмяркоўваецца. Пакуль прынята рашэнне захаваць гэтае звяно. Разам з тым, як паказаў маніторынг, большасць раёнаў Гродзенскай вобласці за тое, каб яго ліквідаваць. Бо 60—70 % дэпутатаў сельскіх Саветаў адначасова з'яўляюцца і членамі сельскага выканаўчага камітэта. Як правіла, гэта кіраўнікі ўстаноў і арганізацый — дырэктар школы, галоўны ўрач, дырэктар сельгаспрадпрыемства і г. д. Пытанні па зваротах, можна сказаць, дублююцца. Да таго ж і дэмаграфічная сітуацыя не спрыяе. Бывае, што на аднаго дэпутата ў сельскай мясцовасці прыпадае ўсяго 130 выбаршчыкаў. Таму мы прапануем надаць больш паўнамоцтваў нашым памочнікам на месцах — органам тэрытарыяльнага грамадскага самакіравання. А на вёсцы гэта староста. Лепш іх матэрыяльна прастымуляваць. Стварыць замест дэпутацкага корпуса грамадскія саветы стараст. Думаю, такая тэма будзе гучаць і на Усебеларускім сходзе.

***— Выбарчая сістэма органаў улады. Наколькі гэта магло б паўплываць на ўмацаванне мясцовага самакіравання?***

— Думаю, што прыспеў час праводзіць выбары мясцовых органаў улады. Гэта і выбары старшыні сельскага выканаўчага камітэта, раённага выканаўчага камітэта, мэра горада. Тут будзе пэўная канкурэнцыя, але яна, лічу, паспрые таму, каб прайшлі самыя дастойныя, ініцыятыўныя, якія даказалі, што могуць працаваць на высокіх пасадах. Зразумела, што трэба ўнесці цэлы шэраг змяненняў у нарматыўныя дакументы, у тым ліку Канстытуцыю. Але гэта тэма, вартая абмеркавання.

**Маргарыта УШКЕВІЧ.**

# Сучасная драматургія для радыё

**Канал «Культура» Беларускага радыё вызначыў пераможцаў радыёконкурсу сучаснай п'есы «Беларускі радыётэатр 2.0», які быў абвешчаны ў сакавіку і прысвечаўся 95-годдзю айчыннага радыёвяшчання.**

Арганізатар творчага спаборніцтва прапанаваў на выбар чатыры тэмы для конкурсных матэрыялаў: «Сучасная беларуская культура і нацыянальная традыцыі», «Чалавек у глабальным свеце», «Сучасная асоба і радыё» і «Гарманічныя адносіны чалавека з прыродай». Сярод асноўных задач конкурсу былі пошук таленавітых сучасных аўтараў, развіццё мастацкага радыёвяшчання ў краіне, стымуляванне творчай моладзі і яе далучэнне да радыёвяшчання.

Удзельнікамі конкурсу сталі самадзейныя і прафесійныя драматургі розных узростаў са сталіцы, абласных і раённых цэнтраў. Найбольшую цікавасць аўтараў выклікалі маральна-этычныя праблемы ў сучасным грамадстве. Згодна з рашэннем журы, у склад якога ўваходзілі прафесійныя пісьменнікі, прадстаўнікі тэатральнага і радыёмастацтва, вызначаны ўладальнікі другога і трэцяга месцаў. Імі сталі Васіль Ткачоў з Гомеля за п'есу «Пераправа» і Улада Альхоўская за п'есу «Гэты ваш лес». Пераможцы атрымаюць дыпломы і памятныя прызы ад арганізатара.

**Алена ДРАПКО.**

## ШАШКІ

**(«Звязда»)** Выпуск № 129

Вынікі бліц-конкурсу на найлепшае рашэнне шашачных кампазіцый майстра спорту з Магілёва Дзмітрыя Камчыцкага. Амаль усе ўдзельнікі бліц-конкурсу справіліся з прапанаванымі заданнямі. Найбольш дакладныя адказы даслалі Сяргей Бурко (Орша) і Ігар Ананіч (Гродна). Яны здолелі таксама знайсці пабочнае рашэнне ў апошнім 10 заданні і сталі пераможцамі бліц-конкурсу.

Для самастойнага рашэння прапануюцца кампазіцыі, складзеныя вядучым аддзела.

**№ 137**



**№ 137**
**Белыя простыя шашкі:** e1, e3, g3, d4, f4, e5, g5 (7)
**Чорныя простыя шашкі:** h2, b4, c5, b6, a7, e7, g7, b8 (8)
**№ 138**
**Белыя простыя шашкі:** e1, f2, g3, d4, g5, f6 (6)
**Чорныя простыя шашкі:** h4, c5, b6, d6, c7, h8 (6)
**№ 139**
**Белыя простыя шашкі:** g3, b6, d6, c7 (4)
**Чорныя простыя шашкі:** b2, d2, b4, h4, a5, d8 (6)
**№ 140**
**Белыя простыя шашкі:** f2, b4, d4, h4, c5, e5 (6)
**Чорныя простыя шашкі:** h2, g5, b6, f6, a7, e7, g7, d8 (8)
**№ 141**
**Белыя простыя шашкі:** b2, a3, g3, h4, c5, d6, h6 (6)
**Чорныя простыя шашкі:** d2, h2, b4, f4, e5, g7, f8 (7)
**№ 142**
**Белыя простыя шашкі:** 38, 32, 34, 27, 28, 29, 30, 24, 17 (9)
**Чорныя простыя шашкі:** 44, 45, 40, 25, 18, 19, 12, 13, 8 (9)
**№ 143**
**Белыя простыя шашкі:** 38, 32, 34, 27, 28, 29, 30, 24, 16, 17 (10)
**Чорныя простыя шашкі:** 45, 40, 25, 18, 19, 12, 13, 6, 8 (9)

У анлайн-турніры Lidraughts Hybrid League Cup 2020 беларускі шашыст правёў цікавую камбінацыю.

**№ 144** Erik van de Weerdhof — С. Дарашэнка.
**Белыя простыя шашкі:** 48, 49, 41, 42, 43, 44, 36, 38, 39, 40, 31, 33, 34, 35, 26, 30 (16)
**Чорныя простыя шашкі:** 32, 27, 22, 24, 17, 19, 11, 12, 13, 14, 7, 8, 9, 2, 3, 4, 5 (17)

1...24-29 2.33:24 (інакш чорныя захопваюць лішнюю шашку) 22-28 1.94/17 — 8.02 3.31:33 19-23 1.50/15 — 2.37 4.38:27 23-29 1.50/15 — 2.48 5.34:23 14-19 1.94/15 — 3.22 6.23:14 09:47 +

Ва ўсіх пазіцыях белыя пачынаюць і выйграюць. Прозвішчы чытачоў, якія дашлюць правільныя адказы, будуць апублікаваны.

**Праверце свае рашэнні:**
Выпуск № 128 ад 04.12.20.
№ 129 fe5, b2, b2, e7, g1(c5)b6, c3X
№ 130 b6(a3:c5)g3, g7, f8, e1X
B(b4)c7, b8(a3)e5X A(b6)c7, b4,b8(d4) f4(c3)c1X
№ 131 cd2, e3, g3, g5, f8, a3, g1X
№ 132 c7(f4)d6, b4, g5, e7, b4, b8(d4) f4(c3)c1X
№ 133 c7, e7, c5, g5, g3, c3, e7, d2(e5) e3X. Поўнае пабочнае рашэнне: 1. d6-e7! f8:d6 2. f2-g3!
калі: 2...h4:f2 то: 3. e3:g1
і далей на: 3...d6-e5 будзе: 4. b2-a3 e5:g7 5. a3:a7 X
на: 3...b4-c3 будзе: 4. f6-g7 c3:a1 5. g7-h8 a1:e5 6. h8:a7 X
на: 3...b6-c5 будзе: 4. d4:b6 d6-e5 5. f6:d4 b4-c3 6. b2-a3 c3:e5 7. b6-a7 X.
калі: 2...h2:d2 то: 3.e1:e5 h4-g3 і белыя тут пераможуць пазіцыйна. Напрыклад, так: 4. f6-e7 d8:f6 5. e5:g7 g3-f2 6. g7-f8 f2-e1 7. d4-e5 e1-h4 8. f8-c5 X.
№ 134 1. 33-28 22:35 2. 27-22 18:36 3. 29:07 02:11 4. 37-31 36:27 5. 32:05 35-40 6. 05-28 40-45 7. 28:06 45-50 8. 38-33+
№ 135 1. 40-34 18:49 2. 48-43 49:29 3. 27-21 26:17 4. 28-22 17:28 5. 32:03+

«Дзякую ўладальніку гэтага шашачнага тварэння і вядучаму за падрыхтоўку выпуску, а таксама рэдакцыі за магчымасць знаходзіць месца на старонцы выдання для друку шашачнага аддзела! Да сустрэчы ў чарговым выпуску!» — піша Фёдар Карпей з Мядзела.

Першымі дакладныя адказы даслалі У. Бандарык (в. Лугавая Слабада, Мінскі р-н), В. Таўкачоў (в. Уздзевічы, Клімавіцкі р-н, Магілёўская вобл.), В. Дударэвіч (в. Новая Мыш, Баранавіцкі р-н, Брэсцкая вобл.), Э. Дамброўскі, А. Галаванаў, П. і В. Шульгі, (усе — Мінск), Ф. Карпей, Л. Жыхар (абодва — Мядзел), У. Панько (Камянец), І. Ананіч (Гродна), В. Ваўчкоў (Маладзечна), У. Дубінскі (Варонеж, РФ), С. Бурко (Орша).

*Пішыце на адрас: газета «Звязда», вул. Б. Хмяльніцкага, 10А, 220013, Мінск. E-mail: info@zviazda.by або vorush@yandex.ru*

**Віталь ВАРУШЫЛА, майстар спорту.**







# ГЛЯДЗІМ «ПАЎЛІНКУ» Ў ТЭЛЕЭФІРЫ



**На наступным тыдні тэлеканал «Беларусь 3» прапаноўвае гледачам музычную камедыю «Пасля кірмашу», якую ў свой час знялі па матывах п'есы Янкі Купалы «Паўлінка».**

Твор быў напісаны ў 1913 годзе, а вось кінаверсію зрабілі на «Беларусьфільме» ў 1972 годзе, хоць існуе яшчэ аднайменная кінастужка 1952 года. Рэжысёрам «Пасля кірмашу» з'яўляецца Юрый Цвяткоў, а сцэнарыстам выступіў Андрэй Макаёнак. Ён, дарэчы, дапамагаў і актрысе Людміле Сенчыной (выканаўцы галоўнай ролі Паўлінкі) адточваць беларускае маўленне падчас здымак. І гэта, можна лічыць, была першая яе галоўная роля на экране. Хоць раней артыстка знялася ў дзіцячай камедыі «Чароўная сіла» і карціне «Шальменка-дзяншчык». Калегамі актрысы па здымачнай пляцоўцы сталі ў камедыі «Пасля кірмашу» таксама акцёры Іван Гаўрылюк, Барыс Новікаў, Галіна Макарава і многія іншыя. Здымкі праходзілі ў вёсцы Слабодка Браслаўскага раёна.

Нагадаем, паводле сюжэту п'есы, дачка Сцяпана Крыніцкага Паўлінка пакахала вясковага настаўніка Якіма. Але бацька планує выдаць яе замуж за шляхціца Быкоўскага. Пасля таго як дзяўчына выказвае сваю незадаволенасць бацькоўскім рашэннем, каханы прапаноўвае ёй збегчы. Аднак усё аказваецца не так проста...

Працяг і завяршэнне гэтай класічнай гісторыі глядзіце ў суботу, 26 снежня, у эфіры сацыякультурнага тэлеканала.

**Алена ДРАПКО.**




## Налета з любімай газетай!

**Усім, хто падпісаўся на І квартал або І паўгоддзе 2021 года, — у падарунак чатыры календары —**
**✓ маляўнічы насценны, ✓ рэлігійны, ✓ народны і ✓ месяцовы**

## «Звязда»: цёплыя словы, цёплыя рэчы»



Калі вы падпісаліся на газету «Звязда» на І квартал або І паўгоддзе 2021 года — запаўняйце картку ўдзельніка, выразайце і дасылайце да 12 студзеня 2021 года ў рэдакцыю на адрас: вул. Б. Хмяльніцкага, 10А, 220013, г. Мінск.

Сярод падпісчыкаў 15 студзеня 2021 года будуць разыграны 7 жаночых камізэлек і суперпрыз — маслены радыятар General Climate. Вынікі будуць апублікаваны ў газеце «Звязда» да 25 студзеня 2021 года.

Прызы можна будзе атрымаць у рэдакцыі да 31 сакавіка 2021 года пры падачы квітанцыі аб падпісцы на «Звязду» на І квартал або І паўгоддзе 2021 года і пашпарта. Пасля 31 сакавіка выдача прызоў спыняецца і прэтэнзіі падпісчыкаў не прымаюцца. Умовы рэкламнай гульні «Звязда»: цёплыя словы, цёплыя рэчы» чытайце ў нумары 230 газеты «Звязда» ад 25 лістапада.

**Тэлефон для даведак (017) 263 66 73.**
**Тэрмін правядзення гульні — з 01.12.2020 да 31.03.2021 года.**

Пасведчанне аб дзяржаўнай рэгістрацыі № 3885 ад 11.11.2020 года, выдадзена Міністэрствам антыманапольнага рэгулявання і гандлю Рэспублікі Беларусь.

**Картка ўдзельніка — падпісчыка «Звязды» на І квартал або І паўгоддзе 2021 года**

Прозвішча, імя, імя па бацьку ______

Падпіска аформлена і аплачана ў ______
*(аддзяленне сувязі)*
______ на І квартал або І паўгоддзе 2021 года

Хатні адрас і тэлефон *(абавязкова)* ______ *(індэкс)*

Удачы ў розыгрышы!

ЁСЦЬ ПЫТАННЕ

# У СТАРЭЙШЫН СТАНЕ БОЛЬШ НАГРУЗКІ?

**У Віцебскім райвыканкаме днямі адбылася дыялогавая пляцоўка па тэматыцы мясцовага самакіравання.**

Народныя выбраннікі, прадстаўнікі грамадскіх аб'яднанняў падзяліліся думкамі наконт рэформ, што плануюцца. Да гэтага такія ж абмеркаванні праводзіліся на ўзроўні сельскіх Саветаў пры актыўным удзеле насельніцтва.

У райвыканкаме гаварылі пра магчымыя навацыі ў дзейнасці прадстаўнічай і іншай улад, аб павышэнні ролі органаў кіравання і самакіравання, неабходнасці пераразмеркавання паўнамоцтваў.

Дыскусія атрымалася, як той казаў, не дзеля справаздачы, а вельмі бурнай. Ды і ўдзельнікі разумелі важнасць шчырай размовы напярэдадні VI Усебеларускага народнага сходу. Усе заўвагі, ідэі, меркаванні будуць улічваца, аналізавацца, акумулявацца.

Старшыня абласнога Савета дэпутатаў Уладзімір Цярэнцьеў падкрэсліў, што раён асаблівы: адзіны ў вобласці бездатацыйны, тут вельмі зацікаўлены ў развіцці сельскіх тэрыторый і адзначыў, што ў кожнага раёна ёсць свая спецыфіка, таму і бачанне неабходных перамен можа вельмі адрозніваца.



Старшыні сельскіх выканкамаў не ўтойвалі, што ахвотных стаць дэпутатамі пярвічнага звяна вельмі мала. Літаральна ўгаворваць даводзіцца тых, хто можа паспрабаваць атрымаць давер выбаршчыкаў. Спецыфіка раёна і ў тым, што, па сутнасці, годны прэтэндэнт на дэпутацтва жыве ў Віцебску, а ў правінцыю прыязджае толькі на працу. Канешне, ён апрыёры не разумее нюансы сельскага жыцця. Ды і па логіцы і не павінен — галоўнае, каб быў прафесіяналам сваёй справы. Таму прагучалі прапановы наконт памяншэння колькасці дэпутатаў сельскіх Саветаў. І ў гэтым выпадку прынцып «лепей — меней, ды лепш» будзе якраз запатрабаваны жыццём.

Кіраўнікі мясцовай улады павінны прызначацца, выказалі ўпэўненасць удзельнікі мерапрыемства.

Шмат цікавых ідэй было агучана пра магчымае ўзмацненне ролі старэйшын. Між іншым, менавіта Віцебшчына была калісьці першапраходцам па прыняцці адпаведных юрыдычных рашэнняў, у тым ліку і наконт прэміравання. Безумоўна, гэтыя вяскоўцы лепш за іншых ведаюць, чым жывуць аднавяскоўцы, якія праблемы трэба вырашаць у першую чаргу, на паводзіны каго трэба звярнуць увагу праваахоўным органам... На сёння яны, па вялікім рахунку, інфарматары сельскіх выканкамаў. За сваю грамадскую дзейнасць, калі яна плённая, прэміруюцца, але не кожны месяц і сумы сімвалічныя. Дык, можа, лепш узмацніць інстытут старэйшын? Гэтая прапанова актыўна абмяркоўвалася на круглым стале.

Што датычыцца магчымых змен працэдуры выбараў у парламент, пакуль што, напэўна, рана казаць пра своечасовасць па прынцыпе партыйных спіскаў. Як, напрыклад, у суседняй Расіі. Ды і партыям яшчэ трэба шмат папрацаваць над тым, каб заваяваць папулярнасць. У прыватнасці, каб выбаршчыкі ведалі не толькі лідараў партый, а хоць бы і кіраўнікоў абласных структур.

**Аляксандр ПУКШАНСКІ.**
**Фота Алега КЛІМОВІЧА.**

МЕРКАВАННЕ

# «Стабільная і развітая Рэспубліка Беларусь — карысна не толькі для нас, але і для ўсіх нашых суседзяў»

**Уладзімір КАРАНІК, старшыня Гродзенскага абласнога выканаўчага камітэта:**

— Праблем у плюралізме меркаванняў і выказванні свайго пункту гледжання мы не бачым: пад гэта створаны дыялогавыя пляцоўкі, каб людзі, якія маюць свой пункт гледжання, маглі яго выказаць, абгрунтаваць ці зразумець у дыскусіі, чаму тыя падходы, што яны прапаноўваюць, не настолькі эфектыўныя.

На першым этапе, сапраўды, у пратэстнай актыўнасці было шмат эмацыянальнага складніка — гэта нармальная рэакцыя арганізма на нешта, з чым ён дагэтуль не сустракаўся. Рэакцыя на стрэс — спачатку адмаўленне, потым агрэсія, затым гандаль, пасля апатыя і толькі потым прыходзіць прыняцце. Зразумела, на этапе агрэсіі было шмат эмоцый, крыўд, якія не маюць ніякіх падстаў.

Зараз да многіх прыходзіць асэнсаванне, што сур'ёзныя пытанні трэба вырашаць не на плошчах, а ў цішыні кабінетаў, і тое, што спробы вырашэння пытанняў на вуліцах — гэта шлях у нікуды. Таму што краіны, якія прайшлі гэты шлях, на жаль, да светлай будучыні не прыйшлі. Многія да гэтага часу не могуць выкараскацца са становішча, у якое іх завяла вуліца.

Таму розныя пункты гледжання, дыскусія ў грамадстве развіццю не перашкаджаюць, у нейкай ступені нават яму дапамагаюць. Але тут трэба ўсведамляць, што на фоне запыту грамадства на перамены тыя ўладай адчуваліся дастаткова даўно. Яшчэ да выбараў выказваліся прапановы аб неабходнасці правядзення канстытуцыйнай рэформы і пераразмеркавання паўнамоцтваў, для таго каб забяспечыць больш аператыўнае вырашэнне пытанняў на месцах і больш хуткі рух наперад. Запыт на перамены мы адчувалі раней і стараемся яму адпавядаць. Але тое, што адчуўшы гэты запыт частка людзей заняла неканструктыўную пазіцыю — гэта развіццю перашкаджае. Перашкаджаюць не меркаванні ці погляды, перашкаджаюць дзеянні. І, на жаль, нашыя найбольш радыкальныя апаненты ў інструментах выбару дзеяння не саромеюцца (прапановы блакіравання дарог, стымулявання забастовак на прадпрыемствах). Дзякуй рабочым, яны правільна разумеюць: ніхто грошы проста так не заплаціць, іх трэба зарабляць. І калі прадпрыемствы спыніцца — страцяцца рынкі збыту і не факт, што яно потым будзе працаваць.



Фота sb.by

Зноў жа дэструктыўныя прапановы забіраць грошы з банкаўскай сферы, што, натуральна, змяншае ліквіднасць банкаў і такім чынам зніжае іх магчымасці для спажывецкага крэдытавання, рэальнага сектара эканомікі. Пастаянныя заклікі не аказваць знешнюю крэдытную падтрымку, спыніць інвестыцыі, увесці санкцыі — гэта стварае адпаведную нервовую абстаноўку і перашкаджае рабоце і развіццю. Прычым гэта віна не нашых грамадзян. Большасць з іх правільна разумеюць сітуацыю, якая склалася. Тыя, хто імкнецца на гэтай сітуацыі спекуляваць і дасягаць сваіх выключна палітычных (у шэрагу выпадкаў карыслівых) мэт, прычым многія з іх, знаходзячыся за мяжой і атрымліваючы фінансаванне ад замежных дзяржаў, мэтанакіравана спрабуюць апустошыць эканоміку роднай краіны. Як патрыёт і грамадзянін, такіх падыходаў я не разумею.

Вядома, што мы кампенсуем негатыўны ўплыў, дзякуючы зробленым захадам мы забяспечылі стабільную эканамічную сітуацыю. Але ў перыяд пандэміі, калі ўвесь свет ліхаманіць, спрабаваць штучна стварыць праблемы для сваёй краіны... Прычым многія гэтыя людзі маюць вопыт дзяржкіравання і выдатна разумелі, што ўсе гэтыя дзеянні не могуць не адбіцца на жыцці звычайных грамадзян. Яны ў любым выпадку ўскладняць жыццё простых грамадзян і адаб'юцца ў змяншэнні іх даходаў. Але ўсё роўна заклікаюць выконваць пэўныя дзеянні, каб прыйсці да ўлады. Вось гэтага я не разумею, не падтрымліваю і як патрыёт не магу падтрымаць.

Я спадзяюся, што эмоцыі сціхнуць (у тым ліку ў нашых замежных партнёраў) і прыйдзе разуменне, што стабільная і развітая Рэспубліка Беларусь побач з іх граніцамі — карысна не толькі для нашай краіны, але і для ўсіх нашых суседзяў.

Што датычыцца правядзення дыялогавых пляцовак — гэта важна, таму што часта людзі ў эмоцыях не зусім правільна разумеюць відавочныя рэчы. Фармат пляцоўкі дае магчымасць даведацца аб тым, што ўжо робіцца. Магчыма, гэта нашая віна, што дзяржава шмат рабіла, але, напэўна, мала казала. І ў людзей склалася няправільнае адчуванне таго, што адбываецца вакол. Нашыя сістэмы адукацыі, аховы здароўя, чыстыя і спакойныя вуліцы — гэта не дадзенасць зверху, а вынік дастаткова карпатлівай і напружанай работы органаў дзяржкіравання. Фразу аб сацыяльна арыентаванай дзяржаве, напэўна, чуў кожны, але аб яе сэнсе ніхто не задумваўся. А калі пачынаеш расказваць пра аб'ёмы фінансавання адукацыі, аховы здароўя і іншых сацыяльных кірункаў, якія паляпшаюць жыццё людзей, гэта ў многіх выклікае здзіўленне і прыходзіць працвераджэнне.

На адной з сустрэч са студэнтамі мне прапанавалі: «А вы не лічыце неабходным размеркаванне фінансаў, напрыклад, на ахову здароўя і на МУС зраўняць?». Я кажу: «Калі ўлічваць, што на ахову здароўя ў нас выдзяляецца грошай больш чым у пяць з паловай разоў, чым на Міністэрства ўнутраных спраў, вы прапануеце ў пяць разоў павялічыць фінансаванне МУС? Ці ў пяць з паловай разоў скараціць фінансаванне аховы здароўя?» У адказ: «Як больш?»...

І колькасны склад сістэмы аховы здароўя ў нас як мінімум у тры з паловай разы большы, чым колькасць супрацоўнікаў МУС. Таму гэтыя відавочныя рэчы трэба расказваць.

Нехта прапануе: давайце не будзем плаціць падаткі, каб у дзяржавы не было магчымасці ўтрымліваць МУС. Таварышы, калі вы не будзеце плаціць падаткі, у першую чаргу пацерпіць не МУС, а міністэрствы адукацыі і аховы здароўя, якія з'яўляюцца асноўнымі спажыўцамі бюджэту. МУС і Мінабароны фінансуюцца па рэштквым прынцыпе. Таму вы стрэліце сабе ў нагу!

Вось гэтага людзі не разумеюць, і дыялогавая пляцоўка — гэта магчымасць яшчэ раз данесці, што робіцца, з аднаго боку, а з другога — дае магчымасць пачуць разумныя ідэі, якія пры адпаведнай дапрацоўцы могуць больш інтэнсіўна ўкараняцца ў жыццё. Напрыклад, фінансаванне мясцовых ініцыятыў. Мне спадабалася адна з ідэй, калі прапаноўваюць выдзеліць невялікую частку бюджэту і даць магчымасць людзям вырашыць самім, на што яе выдаткаваць (добраўпарадкаванне, павышэнне якасці жыцця ў рэгіёне). Мы таксама абмяркоўвалі (тут няма ніякіх заканадаўчых праблем), каб вылучыць нейкі ўчастак фінансавання і пасля правядзення конкурсу сацыяльных праектаў накіраваць туды грошы.

**Вольга АНУФРЫЕВА.**

СЛОВА — ЧЫТАЧАМ

# «Цаню любімую газету за разважлівасць, памяркоўнасць»

Добры дзень, сяброўка «Звязда»!

Пішa табе пастаянная чытачка і аднадумца. З табой я пасябравала яшчэ ў пачатку 90-х гадоў мінулага стагоддзя. Люблю цябе за тое, што на першых старонках нясеш пазітыў. Героямі фота на першай старонцы з'яўляюцца простыя людзі. Гэта не абавязкова «калгаснікі». Ёсць сярод іх і айцішнікі, і ўрачы, і настаўнікі, і вучоныя, і рамеснікі. Вельмі паважаю «Звязду» за тое, што ніколі не здраджвала беларускай мове. Цаню любімую газету за разважлівасць, памяркоўнасць. Вучуся ў сяброўкі гэтым рысам.

Хачу праз газету «Звязда» выказаць словы падзякі дэпутату Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь па Пухавіцкай выбарчай акрузе № 65 **Алегу БЕЛАКОНЕВУ** за падтрымку і дапамогу членам спажывецкага кааператыва «ГазБудЗалужжа» па газіфікацыі аграгарадка Залужжа Старадарожскага раёна. Мы ўжо і надзею страцілі, што будзем з газам, што ўкладзеныя ўласныя сродкі не прападуць, але дзякуючы настойлівасці шаноўнага Алега Аляксандравіча цывілізацыя прыйшла ў наш глухі кут.

Такім чынам улада паказала свой дзейсны падыход не на словах, а на справе. Жадаю шаноўнаму дэпутату моцнага здароўя, вялікага цярпення ў наш няпросты час.

З павагай да сваёй любімай газеты «Звязда» яе пастаянная падпісчыца **Валянціна ЗАЯЦ.**

БЛІЗКАЯ ЎЛАДА

# ПРАЦЯГ З ВЫЕЗДАМ НА МЕСЦА

**У мінулую суботу на пытанні гараджан падчас прамой лініі адказваў старшыня Мінскага гарадскога Савета дэпутатаў Андрэй БУГРОЎ. Ён вызначыў чатыры адрасы для наведвання з мэтай больш дэталёвага вывучэння праблемных сітуацый і іх ацэнкі на месцы.**



Усяго паступіла амаль тры дзясяткі зваротаў. Яны былі розныя па змесце, характары, нават інтанацыі і эмацыянальным суправаджэнні размовы. Людзі гаварылі пра тое, што іх больш за ўсё хвалюе: праблемныя пытанні жыцця ў новых мікраraёнах, хібы ў жыллёва-камунальнай гаспадарцы, даўгабуды ў сталіцы і іншае.

Напрыклад, жанчына, якая жыве на вуліцы Шышкіна, расказала, што вось ужо больш за шэсць гадоў побач з домам № 26 будуецца кафэ. І ўсе гэтыя гады жыхары суседніх дамоў вымушаны мірыцца з нязручнасцямі, выкліканымі дзеяннямі будаўнікоў: брудная дарога, разбітыя тратуары, рэшткі смецця і г. д. Андрэй Бугроў паабяцаў асабіста вывучыць сітуацыю і праінфармаваць аўтара звароту аб прынятых мерах.

Уладзімір Якаўлевіч, жыхар мікрараёна Сокал, у сваім звароце акрэсліў праблематыку развіцця яго сацыяльнай інфраструктуры, якая істотна адстае ад будаўніцтва жылля: школы перапоўненыя, маецца недахоп дзіцячых паліклінік, адсутнічаюць культурныя ўстановы і адукацыйныя цэнтры, няма, напрыклад, басейна і г. д. Аўтар звароту прапанаваў разгледзець магчымасць прыбудовы да будынка школы дадатковага корпуса для дашкольнікаў або вучняў пачатковых класаў.

На думку Андрэя Бугрова, які ўважліва выслухаў маналог суразмоўніка, вырашэнне праблем Сокала патрабуе асаблівай увагі і вялікіх намаганняў. Бо мікрараён будзе толькі расці і развівацца. Жыллё тут прапануецца і шматдзетным сем'ям.

— З улікам меркаванняў жыхароў разам з раённай адміністрацыяй будзем прымаць канкрэтныя рашэнні, — сказаў старшыня Мінскага гарсавета.

У час прамой лініі ён часам уступаў у дыскусію. Так, адзін з мінчан рашуча патрабаваў пафарбаваць пад'езд яго дома, сцены якога размалявалі падлеткі, хутчэй зрабіць новую дзіцячую пляцоўку ў двары.

У сваю чаргу, Андрэй Бугроў паспрабаваў пераканаць чалавека ў неабходнасці самім жыхарам дома праяўляць больш калектывізму і ініцыятывы ў навядзенні парадку там, дзе жывеш, у сваім двары, а не толькі праяўляць незадаволенасць. Можна і самім пабудаваць нешта нескладанае, «скінуцца» па невялікай суме грошай і асвяжыць, пафарбаваць сцены пад'езда разам з падлеткамі ў выхаваўчых мэтах.

Старшыня гарсавета звярнуў увагу і на тое, што некалькі званкоў было на аднолькавую тэму: выказваліся прэтэнзіі да канструкцый прыпынкаў грамадскага транспарту: навес ад дажджу ёсць, а бакавых сценак, за якія можна часова схавацца ад пранізлівага ветру, няма.

Андрэй Бугроў лічыць гэтыя заўвагі справядлівымі і вартымі вывучэння з мэтай наступнага прыняцця адпаведных мер.

Больш уважліва ацаніць стан пешаходных шляхоў зносін у Мінску падказаў зварот Надзеі Мікалаеўны, якая жыве на вуліцы Выгоцкага. Жанчына прасіла дапамагчы абсталяваць тратуарную дарожку да прыпыначнага пункта. Мясцовыя жыхары звярталіся ў раённую адміністрацыю, але пакуль безвынікова.

Старшыня паабяцаў жанчыне, што асабіста выедзе на месца, каб сустрэцца з насельнікамі вуліцы і разам падумаць, як вырашыць іх праблему. Тым больш што пра гэта казалі і іншыя гараджане.

Былі і прыемныя моманты: мінчане выказвалі словы ўдзячнасці за тое, што ў няпростай сітуацыі, выкліканай барацьбой з пандэміяй, гарадскія ўлады знайшлі час і сродкі па-святочнаму ўпрыгожыць сталіцу да Новага года і тым самым узняць людзям настрой.

**Леанід ЛАХМАНЕНКА.**
**Фота Яўгена ПЯСЕЦКАГА.**

# Падаражання быць не павінна...

***(Заканчэнне. Пачатак на 7-й стар.)***

— Як правіла, гандлёвыя сеткі ведаюць, што будзе павышацца попыт, і загадзя да гэтага рыхтуюцца. Дэфіцыту прадуктаў па «індэксе аліўе», як вы яго назвалі, ніколі няма, — адзначыў намеснік міністра.

Дарэчы, ён падкрэсліў, што маніторынг вядзецца пастаянна, а не толькі напярэдадні свят — у МАРГ дастаткова інструментаў для таго, каб уплываць на цэны. Калі, напрыклад, высвятляецца неабгрунтаваны рост цэн, выкарыстоўваюцца меры адміністрацыйнага ўздзеяння аж да закрыцця крам. З пачатку года было выяўлена больш за 170 парушэнняў у цэнаўтварэнні, сума штрафных санкцый перавысіла сто тысяч рублёў, паведаміў Андрэй Картун.

## Мінус запалкі

Між іншым, спіс сацыяльна значных тавараў таксама адкарэктуюць. Зараз у ім знаходзіцца крыху больш за 30 пазіцый, растлумачыў суразмоўнік, па якіх профільнае міністэрства можа ўводзіць часовае рэгуляванне на тэрмін да 90 дзён.

— Ужо практычна завершана работа па аптымізацыі гэтага пераліку. Нейкія пазіцыі будуць дададзены, нейкія — выключаны. Але гэта не значыць, што мы станем рэгуляваць усе сацыяльна значныя тавары. Будзем падыходзіць выбарачна і ўзважана, — падкрэсліў намеснік міністра.

Напрыклад, з гэтага спіса прапануюць выключыць запалкі, таму што яны не займаюць значнага месца ў спажывецкім кошыку. Нават пры змене кошту запалкі не паўплываюць на інфляцыю. Якія пазіцыі з'явяцца, суразмоўнік не канкрэтызаваў.

У міністэрстве лічаць лагічным рэгуляваць цэны на тыя пазіцыі,



Напярэдадні Новага года важна звяртаць увагу на цэнавыя змены ў наборы прадуктаў для навагодняга стала, якія не ўваходзяць у спіс сацыяльна значных тавараў, як, напрыклад, хлеб ці малако. Але, пагадзіцеся, пераплачваць за бутэльку шампанскага ці мандарыны не хоча ніхто.

якія аказваюць найбольшы ўплыў на цэны іншых прадуктаў. Напрыклад, калі дзейнічае дзяржрэгуляванне кошту мяса і мясапрадуктаў, ускосна гэта ўплывае і на іншыя прадукты.

— Таму няма неабходнасці рэгуляваць усе пазіцыі. Трэба падыходзіць кропкава. Сыравяленая каўбаса прэміум-сегмента не адносіцца да сацыяльна значных тавараў. Такія пазіцыі мы будзем выключаць. Тое самае і малочная група: няма неабходнасці рэгуляваць глазураваныя сыркі, трэба рэгуляваць толькі малако, калі ў гэтым ёсць неабходнасць, — удакладніў Андрэй Картун.

## Віртуальны маніторынг

Дарэчы, падыходы да вывучэння цэн на спажывецкім рынку таксама павінны змяніцца. Зараз плануецца стварэнне ў нашай краіне анлайн-сістэмы маніторынгу цэн, якая будзе выкарыстоўваць даныя сістэмы кантролю касавага абсталявання.

Як паведаміў суразмоўнік, цяпер ідзе работа над тым, каб у рэжыме анлайн атрымліваць інфармацыю ад гандлёвых сетак па дынаміцы цэн і продажаў. На першым этапе будзе пералік асноўных пазіцый — каля сотні, аб якіх Міністэрства антыманапольнага рэгулявання і гандлю штодзённа будзе атрымліваць інфармацыю ад Міністэрства па падатках і зборах на аснове даных сістэмы кантролю. Гэтыя звесткі дапамогуць адсочваць пазіцыі, якія істотна ўплываюць на інфляцыю.

Стварэнне анлайн-сістэмы прадугледжана антыінфляцыйнай праграмай на 2021—2023 гады. Гэта дазволіць у большай ступені лічбавізаваць працэс маніторынгу цэн.

У ТЭМУ

# Даражэй — у Мінску, танней — на Гомельшчыне

### ФПБ прапануе дадатковыя меры для захавання стабільнасці цэн на найважнейшыя тавары

Федэрацыя прафсаюзаў працягвае штомесяц праводзіць маніторынг цэн на найважнейшыя тавары і паслугі ва ўсіх рэгіёнах краіны.

Як паведамілі ў прэс-службе нацыянальнага прафцэнтра, у лістападзе ў параўнанні з аналагічным перыядам мінулага года на большасць тавараў павышанага попыту цэны засталіся практычна на папярэднім узроўні. У многім гэта вынік таго, што вясной па ініцыятыве ФПБ Мінстэрствам антыманапольнага рэгулявання і гандлю было прынята рашэнне аб увядзенні цэнавага рэгулявання на гэтую групу тавараў. Апошняе дало магчымасць пазбегнуць рэзкага пад'ёму цэн на найбольш папулярныя тавары.

Разам з тым быў адзначаны істотны рост цэн на асобныя прадукты харчавання. Што стала даражэй? Бульба, бабовыя, грэчка, маргарын, сланечнікавы алей, рыс, рыба, а таксама сезонныя прадукты: таматы, агуркі, яблыкі, цытрусавыя. Пры гэтым значны рост цэн на шэраг такіх прадуктаў назіраецца ўжо не першы месяц, звяртаюць увагу ў ФПБ. Калі казаць пра цэнавую сітуацыю ў рэгіёнах, то ў лістападзе максімальна высокія цэны фіксіраваліся ў Мінску, самыя нізкія — у Гомельскай вобласці.

Улічваючы сітуацыю на сусветным рынку, уплыў пандэміі на эканоміку ўсіх краін, ФПБ прапануе падоўжыць у 2021 годзе дзеючы механізм кантролю і рэгулявання цэн на найважнейшыя тавары і паслугі па ўсім ланцужку — ад вытворцы да прылаўка.

Акрамя таго, для выключэння ў зімова-вясновы перыяд росту цэн на традыцыйную агародніну (бульбу, капусту, моркву і буракі) нацыянальны прафцэнтр акцэнтуе ўвагу на неабходнасці ўдасканальвання падыходаў да фарміравання стабілізацыйных фондаў.

— Сёння неабходна выпрацаваць механізмы, якія гарантавалі б, што прадукцыя ў гэтых фондах будзе захоўвацца ў неабходнай колькасці і па вызначаным кошце. Для гэтага неабходна забяспечыць доўгатэрміновыя кантракты паміж вытворцамі і прадаўцамі з гарантаванай аплатай на ўвесь перыяд. Акрамя таго, Федэрацыяй прафсаюзаў прапанавана прапрацаваць пытанне выдачы льготных крэдытаў, вызначыць памеры субсідый для кампенсацыі часткі выдаткаў на выплату працэнтаў за карыстанне банкаўскімі крэдытамі, якімі скарысталіся для стварэння міжсезонных запасаў. Таксама прапануем выкарыстоўваць паніжальныя каэфіцыенты да стаўкі зямельнага падатку юрыдычным асобам, якія захоўваюць і рэалізуюць стабілізацыйныя фонды, назапашваюць гэтую прадукцыю ў сельгаспрадпрыемстваў і насельніцтва. Усе адпаведныя прапановы ўжо накіраваны намі ва ўрад, — паведаміла па выніках правядзення экспертнага савета па цэнах і тарыфах **намеснік старшыні Федэрацыі прафсаюзаў Алена МАНКЕВІЧ.**

**Вольга АНУФРЫЕВА.**

МЯСЦОВАЕ САМАКІРАВАННЕ

**РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ № 15 ад 17 лютага 2009 года выдадзена Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь.**
**Заснавальнікі:** Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда».

**Выдавец — рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда»**

**Дырэктар — галоўны рэдактар КАРЛЮКЕВІЧ АЛЯКСАНДР МІКАЛАЕВІЧ.**

**Адказны за выпуск: АНУФРЫЕВА В. А.**

www.zviazda.by

e-mail: info@zviazda.by
(для зваротаў): zvarot@zviazda.by

АДРАС РЭДАКЦЫІ:
220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10а.
**КАНТАКТНЫ ТЭЛЕФОН** 311 17 35;
**e-mail:** info@zviazda.by

**Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛП № 02330/106 ад 03.04.2009. 220013, г. Мінск, прасп. Незалежнасці, 79/1.**

**Тыраж 14.804.** **Нумар падпісаны ў 19.30 17 снежня 2020 года.**




## ШКАДА ПТУШАЧКУ...

### АЛЬБО АБ ТЫМ, ЯК ПАСВАРЫЛІСЯ МІТРАФАНАВІЧ І АРКАДЗЕВІЧ

Гісторыю пра іх варта пачаць здалёк: з таго, што гэтыя два дзядзькі жылі ў вёсцы, у суседстве, працавалі ў адным калгасе, што вайну адзін аднаму яны, як быццам, не аб'яўлялі, аднак згоды ў іх таксама не было...

І ўсё, відаць, таму, што кожны лічыў сябе хай не самым разумным, але ж разумнейшым за іншага, прычым — ва ўсім. Ну хоць бы ў грамадзянскай пазіцыі, у барацьбе з недахопамі.

Было, напрыклад: на ферме злавілі злодзея. І нават не ўпершыню. Аркадзевіч тут жа дае сігнал у інстанцыі: маўляў, так і так, ці ёсць у калгасе начальства, а калі ёсць, то куды глядзіць?..

З інстанцыі праз нейкі час камісія, праверка — Аркадзевічу пісьмовы адказ: маўляў, факты чаcткова пацверджаны. Кіраўніцтва ў калгасе ёсць і яно строга папярэджана...

Мітрафанавіч жа з любым непарадкам змагаўся інакш: ён з сабою насіў аброць. А далей...

Заўважыць, напрыклад, што нехта з даглядчыкаў не тое што крадзе, проста неахайна вязе — рассыпае кармы для жывёлы, і...

На першы раз яшчэ можа прыгразіць, а вось на другі — ужо наўрад.

Баяліся яго... Нават тое ж калгаснае начальства, бо дзядзьку, як выглядала, было ўсё роўна, каго аброццю сцебануць. Родная жонцы гразіў (яна таксама на ферме працавала), што калі з работы хоць нешта прынясе, — прыб'е на месцы.

...Вось такія былі суседзі і такія ў іх метады барацьбы. Аркадзевіч лічыў, што лепшыя — у яго, бо законныя, Мітрафанавіч — што ў яго, бо дзейсныя!.. Ды і хто, скажыце, быў той Аркадзевіч? Галота няшчасная. Падхалім: для таго каб да начальства наблізіцца, нават размаўляць стараўся па-руску — акурат як яно...

А вось Мітрафанавіч — ён не з галоты, ён з хутаран, з сапраўдных гаспадароў! Праўда, неяк...

Значыць, ідзе ён дамоў на абед са сваёю аброццю. Глядзіць — на вуліцы два пеўні б'юцца: суседаў здыхлік, можна сказаць, і ягоны цар...

Які перамагае?

Ну, зразумела ж...

Пастаяў каля іх Мітрафанавіч, палюбаваўся на свайго певуна ды яшчэ і падахвоціў: маўляў, дай яму, дай, пакажы, хто галоўны... Ды і пайшоў сабе ў хату. Папалуднаваў там, газету пачытаў — пара на работу ісці. Зняў аброць і шапку з цвіка, выйшаў на вуліцу, а там...

Вочы б не бачылі: той суседаў здыхлік ужо, здаецца, таго — дабіў ягонага пеўня!

— Кыш, каб ты здох! — кінуўся да птушкі Мітрафанавіч. А ўжо ж як замахнуўся, як абазваў гаспадара...

Той якраз гной выкідаў, з віламі на шум гэты выйшаў. І маўчаць таксама ж не стаў. Пасварыліся мужыкі. Можа, нават пабіліся б, але ж Мітрафанавіч разумеў, што з аброццю на вілы — як з відэльцам на танк...

А да ўсяго яшчэ і сам вінаваты: «не разняў» двух пеўняў, «падставіў» свайго...

Карацей, згоды паміж суседзямі не было і раней, а з тога часу яны яшчэ і вітацца перасталі, бо ў абодвух прынцыпы, з-за якіх...

Загінуў певень, без пары галаву злажыў. А галоўнае — ні за што.

**Соф'я Сарокіна,**
*Жлобінскі раён.*

## КАНДРАТ І ЯГОНЫЯ ЖОНКІ

Некалі ў нашай вёсцы жыла цікавая пара — Кандрат і Агапка. Дзяцей у іх не было, і — хто ведае — можа, з гэтай прычыны надумаў гаспадар сабе іншую жонку шукаць — маладую.

Колькі там часу прайшло, — знайшоў, прывёў да сябе ў хату. Старой, як быццам, трэба было б сыходзіць, а няма куды — прыйшлося, беднай, застацца.

Так яны і зажылі: новая жонка спаць кладзецца з Кандратам, былая — лезе на печ. Ды і каля печы яна па-ранейшаму за гаспадыню...

Раніцай неяк падступілася, каб запаліць, каб зрабіць для сям'і снеданак, а дроў няма.

Пабудзіла яна маладую Кандратаву жонку. Удзвюх пайшлі пілаваць.

— Ну, а зараз яшчэ і пасячом, — распараджаецца Агапка.

— Яшчэ чаго?! — фыркае маладзіца. — Няхай Кандрат сячэ!.. Ды і наогул, Агапка, — я на тваім месцы ўжо даўно б яму галаву адсекла!

Гаворыць яна так і не бачыць, што Кандрат у яе за спінай стаіць, што ён усё гэта чуе. А потым як закрычыць:

— Агапка, а ну запрагай кабылу! Грузі на воз барахло гэтай сцервы!.. Каб у нашай хаце нават духу яе не было!..

Прагнаў маладуху, а з Агапкай жыць застаўся.

**Міхась Сліва,**
*г. Рагачоў*

## ЛЮДЗІ МОГУЦЬ ПА-РОЗНАМУ ЖЫЦЬ...

Некалі даўно моладзь з вёсак з'язджала, цяпер — хто-ніхто з тых хлопцаў і дзяўчат пачынае вяртацца. Вось і мая прыяцелька, атрымаўшы «званне» пенсіянеркі, пакінула ў Мінску трохпакаёвую кватэру — пераехала на радзіму, у бацькаву хату.

Надоечы мы ўспаміналі з ёй даўнейшае: маіх бацькоў ды яе дзеда Лёксу і бацечку Пятра (хай на тым свеце ім добра будзе, бо добрыя ж людзі!)... І такія заўзятыя рыбакі! Можна сказаць, нават хворыя, на рыбалку, бо абодвум без розніцы было, зловяць што ці не зловяць, дзвюх плотак для катоў ці па пяць шчупакоў — ім галоўнае пасядзець... Ну і юшку зварыць на беразе. Калі пашчасціць, — то найлепш на закуску.

Дык вось неяк раз пайшлі яны з вудамі на рэчку (гэта блізка ў нас). Пахадзілі там, пасядзелі — клёву амаль не было, а вось думка адна даймала:

— Слухай, бацька, ты помніш, які сёння дзень? — папытаўся сын.

— А як жа! — усміхнуўся стары. — Пятра і Паўла... Вялікае свята. Тваё...

— Дык у мяне гатовая брага ў лазні. Можна гарэлку выгнаць.

Ад гэтых слоў мужчыны тут жа прыступілі да справы — не скажаш, што прывычнай (пасля вайны гарэлку доўга не гналі — не было з чаго), але ж знаёмай... А таму не дзіва, што досыць хутка з тонкай трубкі змеевіка ўжо заструменіў пахкі (з чыстага жыта!) натурпрадукт. У Пятра аж слінкі пацяклі — падставіў конаўку... Аднак бацька строга прыгразіў:

— Не смецькі!.. Зробім справу, — тады.

...Да канца яе заставалася ўсяго нічога, калі з-за кустоў паказаўся Рыгор, ён жа — першы стукач у акрузе... «Ну ўсё — нам турма», — падумалі бацька з сынам, але ж іншага выйсця не бачылі: прывецілі «госця», пачаставалі гарэлкай, далі прыкусіць. А заадно дзед Лёкса спытаў: «Рыгор, ты ж ведаеш, дзе месца для языка?.. Правільна — за зубамі. Дык ты ж глядзі — пабудзь чалавекам, не выдавай...». — «Ды што вы? Бронь божа! Маўчу, як магіла!» — паабяцаў Рыгор. І пры гэтым так хутка пашыбаваў у бок сельсавета, што сумненняў не заставалася: здасць іх... Як піць дасць!

Значыць, бацьку з сынам трэба было спяшацца. Над вогнішчам яны спехам павесілі кацялок з рыбай. Увесь самагонны рыштунак хуценька разабралі і «ўтапілі» ў рацэ... Вядро з гарэлкай схавалі не паспелі — пачуўся гул матацыкла: з'явіўся іх участковы, а з ім яшчэ і ўпаўнаважаны з сельсавета.

Прыезджыя ўдвух і досыць уважліва агледзелі тэрыторыю вакол трыногі, зазірнулі ў кацялок, дзе варылася юшка.

— Добра пахне, скажы! — прызнаў участковы. — Прыпраўкамі...

— Я нічога не чую, — адказаў «паняты». — Насмарк...

«Няўжо пранясе?» — не паверылі шчасцю самагоншчыкі, бо, нічога крымінальнага не ўбачыўшы, «госці» ўжо збіраліся пісаць пратакол... Два вядры ля крынічкі ў апошні момант заўважылі.

— Глянь, што там, — даручыў «панятому» ўчастковы.

«Не пранесла», — зноў жахнуліся бацька з сынам, гледзячы, як той упаўнаважаны кіруе да крыніцы, як нахіляецца над вядром.

— Вада! — закрычаў здалёк «пасланец».

— А яе, што, з гэтай крыніцы п'юць? — спытаў участковы ў дзеда.

— Мы прывычныя, п'ём бывала, — не схлусіў той. — А вось вам — я ніяк бы не раіў...

Трэба сказаць, што дзед Лёкса ў акрузе чалавекам быў вельмі паважаным — шчырым працаўніком, ветэранам вайны, ардэнаносцам... Да яго парад проста грэх было не прыслухацца.

У выніку «экіпаж» з чым прыехаў, з тым і паехаў: самагонка засталася ў вядры... Вось толькі пяць пасля перажытага мужчынам зусім не хацелася — нават пад юшку, на святога Пятра.

...Згадалі мы з прыяцелькай гэту гісторыю, і ў памяці міжволі ўсплылі радкі Сяргея Астравога: «В жизни можно по-разному жить. / В горе можно и в радости. / Вовремя есть, Вовремя пить. / Вовремя делать гадости...»

Былі ды і засталіся, на жаль, вось такія «аматары». Але ж добрым словам і куды часцей мы ўспамінаем іншых... Ды хоць бы і таго ўчастковага з «панятым», якія, ну вядома ж, маглі б тады пасадзіць «самагоншчыкаў», зламаць жыццё іх жонкам, дзецям, кінуць цень нават на ўнукаў, але...

Добрае імя ім было даражэй.

**Ніна Сашына,**
*Бярэзінскі раён.*

**Рубрыку вядзе Валянціна ДОЎНАР.**

***Ад яе ж.*** *«Апошнія лісткі ў календары, сыходзіць год — самотны і стары...» Гэта была апошняя (сёлета) падборка вясёлых і праўдзівых гісторый. Час вызначаць найлепшыя.*

*Нагадаем, што рэдакцыя робіць гэта з улікам меркаванняў чытачоў. А таму, калі ласка, напішыце, што спадабалася, што запомнілася, каго з аўтараў варта прызнаць найлепшым расказчыкам — пераможцам традыцыйнага звяздоўскага конкурсу — і ўручыць памятныя прызы.*

Неасабісты суб'ектыў



# Новы год як прадчуванне

### Ці залежыць святочны настрой ад наяўнасці аліўе і мандарынаў?

У снежні, нават такім не падобным на самога сябе, як было летась і як, мяркуючы па ўсім, будзе сёлета, заўсёды згадваецца дзяцінства і незвычайнае лёгкае пачуццё прадчування чароўнага свята. Стараешся яго, гэта пачуццё, злавіць хоць на хвіліну, — а не атрымліваецца. «Можа, справа ва ўзросце?» — скептычна сама ў сябе пытаешся. Можа. А можа, яшчэ і ў тым, што памяняліся аб'ектыўныя абставіны. Тое, чаго не было, ёсць напоўніцу. А таго, што здавалася звычайным і абавязковым, — няма.

Ну вось глядзіце. Ядомыя сімвалы свята. Мандарыны. Ці зялёны кансерваваны гарошак. Цяпер у любым, нават вясковым, магазіне ці аўтакраме ён у наяўнасці. Калі ж магазін большы — «прадстаўлены шырокі асартымент». Выбірай на любыя густ і кашалёк. А раней жа мандарыны былі менавіта навагодняй раскошай — каб іх пакаштаваць, за імі трэба было яшчэ і пабегаць-пашукаць-пастаяць у чарзе. І тое ў горадзе. Калі ж гэтыя дзівосныя фрукты хтосьці з гарадскіх прывозіў у вёску — інакш чым райскія яблыкі, якія шанцуе каштаваць толькі выбраным, яны не ўспрымаліся. Іх пах, які трывала замацаваўся як пах Новага года, змешваўся з пахамі хвоі ад прынесенай з марознага лесу ёлкі і здаваўся самым лепшым, самым святочным водарам у жыцці. Я, калі шчыра, не памятаю, якія былі мандарыны майго вясковага дзяцінства на смак: салодкія ці кіславатыя, але дакладна ведаю, што смак той быў — найлепшы... А што цяпер? Ходзіш між скрынак з аранжавымі пладамі, выбіраеш: гэтыя абхазскія, гэтыя іспанскія, гэтыя з Егіпта. Круціш носам: у гэтых костачак шмат, гэтыя чысціцца дрэнна, гэтыя кіслыя. Якое ж тут свята і яго прадчуванне? Звычайны паход у звычайны магазін, прычым незалежна ад пары года.

Ці той жа гарошак. Памятаеце гэтыя літровыя венгерскія бляшанкі з цёмна-сінім канцікам? Таксама дэфіцыт, таксама атрыбут менавіта Новага года. Мяккія зялёныя гарошыны, якія асцярожна, каб, крый божа, якая не звалілася на падлогу, горкай высыпалі на астатнія накрышаныя «працэцкія» інгрэдыенты аліўе і асцярожна перамешвалі, дадаючы пакрысе яшчэ адзін дэфіцытны прадукт — маянэз, закатаны пад блакітнай бляшанай крышачкай у маленькім слоічку. Яго не лілі — накладвалі лыжкай, такі быў густы. Слоічка на вялікую міску святочнай салаты не хапала — і тады шчодра дабаўлялі жоўтай вясковай смятаны. Не ведаю — можа, менавіта з-за яе тая аліўе з дзяцінства была самай смачнай з усіх, што даводзілася каштаваць за жыццё. Дарэчы, «аліўе» гэтую салату ніхто не зваў — ён быў «гарошак» (пэўна, з павагі да яго галоўнага дэфіцытнага складніку). А бляшанка з-пад гарошку з напісанымі на ёй замежнымі белымі літарамі, старанна вымытая, ставілася куды на шафку ці на загнетак — гэткі своеасаблівы сімвал тагачаснага дабрабыту. Падобныя ёмістасці, як і бляшанкі ад растваральнай індыйскай кавы (памятаеце, такія сакавіта-карычневыя з літарамі наўскос), і сёння можна ўбачыць на вясковых кухнях — у іх гаспадыні захоўваюць якую дробязь, каляндру ці насенне фасолі, напрыклад.

Цяпер жа гарошку — хоць венгерскага, хоць іспанскага, хоць свайго, тураўскага (дарэчы, апошні, як на мой густ, самы ўдалы)... У бляшанках, у слоіках, нават у тэтра-упакоўцы. І маянэз ліецца ракой — ва ўсіх сэнсах. І посны, і салатны, і «той самы» правансаль (праўда, ніякі не «той самы»). Пайшоў, купіў, прынёс, з'еў, упакоўку выкінуў. Хоць кожны дзень, калі жаданне ёсць і здароўе дазваляе. Ну і дзе тут свята?

І з нехарчовым складнікам — тое самае. Як цяпер дзіцяці карнавальны касцюм здабываюць? Правільна, у інтэрнэт-краме ці ў звычайнай. Хочаш новы — калі ласка, хочаш б/у — яшчэ прасцей і танней. Купіў, прынёс, надзеў адзін вечар, паклаў у шафу (пусціў на анучы, выставіў на продаж). Дзе свята? І каб не фоткі, ці запомніць дзіця, кім яно было на ранішніку летась? А пазалетась? А ў выпускной групе?.. Мы нядаўна з сястрой прыгадвалі Новы год, дык яна здзівіла: памятае, які касцюм быў у яе ў другім класе, а ў брата ў пятым. Яна была Кветачка, а брат быў Чорт. І яны два тыдні з мамай вечарамі майстравалі ёй на спадніцу пялёсткі з кардону, абшываючы іх пафарбаванай марляй, а брату прышывалі да трыко звіты з вяровак і вымачваны ў чарніле хвост і мацавалі на абручык з дроту рожкі. Што тут дзіўнага? Проста было гэта пяцьдзясят гадоў назад — а помніцца. Што ўжо казаць пра мае «маладзейшыя» гадоў на пятнаццаць успаміны. Я нават помню пах лаку для пазногцяў, які «пазычылі» з мамай у сястры. Ён быў з бліскаўкамі, за вялікія грошы прывезены з Германіі. Але ж у мяне быў касцюм Сонейка — і на кароне, якая ў выглядзе чырвонага сонца з прамянямі была зроблена з кардону, так не хапала бліскавак. Бутэлечкі лаку нам якраз хапіла, і першы мой у жыцці школьны касцюм (а яшчэ ж была выканана песня «Выглянуло солнышко, блещет на лугу») заняў на карнавале першае месца. Год быў, здаецца, 1981-ы. Чаму помніцца? Таму што з дэталямі, з радасцю, з тым самым прадчуваннем свята...

ЗРЭШТЫ, галоўнае — не гэтыя матэрыяльныя складнікі. І нават не тое, што тады — дзесяць, дваццаць, трыццаць, сорак, пяцьдзясят гадоў назад — была сапраўдная зіма — з гурбамі да аблокаў, са скрыпучымі маразамі і сляпучым халодным сонцам, з дрэвамі, калматымі ад шэрані. Галоўнае было ў іншым. У тым, як нашы бацькі, бабулі-дзядулі ўмелі радавацца дробязям накшталт бляшанкі венгерскага гарошку, умелі зрабіць свята, выразаўшы яго з кавалку кардону і абцягнуўшы пафарбаванай у зялёны марляй, умелі падарыць любоў і ўвагу кожнаму з сям'і. Пэўна, дзякуючы гэтаму, апошняму, і захавалася на ўсё жыццё дзівоснае прадчуванне чароўнага свята.

Што сёння нам перашкаджае дарыць яго самім сабе і нашым дзецям? Калі адкажу: ніхто і нішто, акрамя нас саміх, — думаю, буду мець рацыю.

**Алена ЛЯЎКОВІЧ.**

# ИЗВЕЩЕНИЕ о проведении 22 января 2021 года торгов с условиями по продаже имущества, принадлежащего ОАО «ДСТ № 7»

**Предмет торгов № 1**

Изолированное помещение с инв. № в ЕГРНИ 500/D-70786223 общей площадью 156,6 кв. м, расположенное по адресу: г. Минск, ул. Лейтенанта Кижеватова, 8-20 (наименование: помещение общественного питания, назначение: помещение общественного питания); изолированное помещение с инв. № в ЕГРНИ 500/D-70786222 общей площадью 53,0 кв. м, расположенное по адресу: г. Минск, ул. Лейтенанта Кижеватова, 8-19 (наименование: помещение физкультурно-оздоровительного и спортивного назначения, назначение: помещение физкультурно-оздоровительного и спортивного назначения); изолированное помещение с инв. № в ЕГРНИ 500/D-70786220 общей площадью 12,5 кв. м, расположенное по адресу: г. Минск, ул. Лейтенанта Кижеватова, 8-17 (наименование: помещение санитарно-бытового назначения, назначение: помещение санитарно-бытового назначения)

Начальная цена: 525 500,00 бел. руб. без учета НДС

Сумма задатка: 52 500,00 бел. руб.

Обременение: аренда

**Предмет торгов № 2**

Капитальное строение с инв. № в ЕГРНИ 500/С-45775 общей площадью 11,6 кв. м, расположенное по адресу: г. Минск, ул. Лейтенанта Кижеватова, 8/1 (наименование: здание неустановленного назначения, назначение: здание неустановленного назначения); капитальное строение с инв. № в ЕГРНИ 500/С-1003303 протяженностью 610,0 п. м, расположенное по адресу: г. Минск, ул. Лейтенанта Кижеватова, 8 (наименование: кабельная сеть наружного освещения, назначение: сооружение специализированное энергетики, составные части и принадлежности: кабельная линия (лит. 1-4); опора освещения (лит. 1-18); архитектурно-декоративная подсветка (лит. 1-26); капитальное строение с инв. № в ЕГРНИ 500/С-1002630 протяженностью 518,4 п. м, расположенное по адресу: г. Минск, ул. Лейтенанта Кижеватова, 8 (наименование: тепловая сеть, назначение: сооружение специализированное коммунального хозяйства, составные части и принадлежности: трубопровод тепловой сети (Литер 1), трубопровод тепловой сети (Литер 2), трубопровод тепловой сети (Литер 3); капитальное строение с инв. № в ЕГРНИ 500/С-1003304 протяженностью 1 100,0 п. м, расположенное по адресу: г. Минск, ул. Лейтенанта Кижеватова, 8 (наименование: кабельная сеть 0,4 кВ, назначение: сооружение специализированное энергетики, составные части и принадлежности: низковольтный кабель (лит. 1-4); капитальное строение с инв. № в ЕГРНИ 500/С-1002877 протяженностью 388,8 п. м, расположенное по адресу: г. Минск, ул. Лейтенанта Кижеватова, 8 (наименование: ливневая канализационная сеть, назначение: сооружение специализированное коммунального хозяйства, составные части и принадлежности: трубопровод ливневой канализации (литер 1-36), ливневой колодец (литер 37-39), дождеприемник (литер 40-42), очистные сооружения (литер 43-44); капитальное строение с инв. № в ЕГРНИ 500/С-1002879 протяженностью 331,0 п. м, расположенное по адресу: г. Минск, ул. Лейтенанта Кижеватова, 8 (наименование: канализационная сеть, назначение: сооружение специализированное коммунального хозяйства, составные части и принадлежности: трубопровод канализационной сети (Литер 1), трубопровод канализационной сети (Литер 2), трубопровод канализационной сети (Литер 3), трубопровод канализационной сети (Литер 4), трубопровод канализационной сети (Литер 5); капитальное строение с инв. № в ЕГРНИ 500/С-1002631 протяженностью 488,0 п. м, расположенное по адресу: г. Минск, ул. Лейтенанта Кижеватова, 8 (наименование: водопроводная сеть, назначение: сооружение специализированное коммунального хозяйства, составные части и принадлежности: трубопровод водопроводной сети (Литер 1), трубопровод водопроводной сети (Литер 2), Трубопровод водопроводной сети (Литер 3), трубопровод водопроводной сети (Литер 4), трубопровод водопроводной сети (Литер 5), футляр (стальной) (Литер 6), футляр (стальной) (Литер 7), футляр (стальной) (Литер 8);
шлагбаум WIL6 с инв. № 47003 2010 года ввода в эксплуатацию; шлагбаум автоматический с инв. № 47002 2009 года ввода в эксплуатацию

Начальная цена: 266 308,85 бел. руб. без учета НДС

Сумма задатка: 26 600,00 бел. руб.

**Продавец имущества:** ОАО «ДСТ № 7», 223021, Минская обл., Минский р-н, 500 м восточнее д. Богатырёво, АБК, тел. (017) 507-61-83.

**Организатор торгов:** государственное предприятие «МГЦН», ул. К. Маркса, 39, к. 10, 220030, г. Минск, тел. (017) 363-25-62.

**Условие торгов:** победитель торгов (покупатель) оплачивает вознаграждение за организацию и проведение торгов, включающее затраты на организацию и проведение результативного аукциона, в размере 1 процента от цены продажи предмета торгов, указанной в протоколе о результатах торгов, в течение 3 рабочих дней со дня проведения торгов.

Торги проводятся в соответствии со ст.ст. 417, 418 Гражданского кодекса Республики Беларусь и порядком проведения аукциона по продаже имущества ОАО «ДСТ № 7», утвержденным организатором торгов.

К участию в торгах допускаются юридические и физические лица, внесшие задаток и заключившие соглашение с организатором торгов о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона по соответствующему предмету торгов, а также представившие организатору торгов следующие документы:

заявление на участие в аукционе (по форме, установленной организатором торгов); заявление об ознакомлении с документами, продаваемым имуществом, порядком проведения аукциона (по форме, установленной организатором торгов); копию свидетельства о регистрации (для юридических лиц и индивидуальных предпринимателей); копию устава (для юридических лиц); копию платежного документа о внесении задатка; документы, подтверждающие полномочия представителя юридического (физического) лица; а также при необходимости иные документы в соответствии с порядком проведения аукциона.

*Задаток перечисляется в срок, установленный для приема документов на участие в аукционе, на расчетный счет государственного предприятия «МГЦН» № BY15 BLBB 3012 0190 3985 8300 1001 в ОАО «Белинвестбанк», центр банковских услуг № 527, г. Минск, БИК BLBBBY2X, УНП получателя 190398583.*

Торги проходят в форме открытого аукциона с условиями на повышение начальной цены. Торги проводит аукционист, определенный организатором торгов. В процессе торгов начальная цена повышается аукционистом до тех пор, пока только один участник согласится приобрести предмет торгов. Данный участник объявляется победителем торгов, а наивысшая цена (цена продажи) фиксируется в протоколе о результатах торгов и не включает НДС. В ходе торгов участники могут предлагать свою цену за продаваемое имущество в соответствии с порядком проведения аукциона.

В случае если торги признаны несостоявшимися в силу того, что заявление на участие в них подано только одним участником или для участия в них явился только один участник, предмет торгов продается этому участнику (покупателю) при его согласии по начальной цене, увеличенной на пять процентов.

Договор купли-продажи между продавцом и победителем торгов (покупателем) заключается после предъявления копии платежных документов о перечислении суммы вознаграждения за организацию и проведение торгов и подписывается в течение 10 рабочих дней со дня проведения торгов.

Оплата стоимости приобретенного имущества с учетом НДС осуществляется победителем торгов (покупателем) в порядке, предусмотренном в договоре купли-продажи. По согласованию с продавцом возможна рассрочка платежа.

Торги проводятся **22 января 2021 года в 12.00** по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, зал аукционов. Прием документов, а также консультации по вопросам участия в торгах осуществляются **с 21.12.2020 по 20.01.2021 включительно** в рабочие дни с 09.00 до 13.00 и с 14.00 до 17.00 (по пятницам – до 16.45) по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, каб. 6.

**Телефоны для справок:**
**(017) 365-48-36 (государственное предприятие «МГЦН»);**
**(017) 507-61-83 (ОАО «ДСТ № 7»).**

# ЗАО «БЕЛРЕАЛИЗАЦИЯ» ОБЪЯВЛЯЕТ АУКЦИОН

Организатор торгов: **ЗАО «Белреализация»** (УНП 191113330), 220089, г. Минск, ул. Уманская, 54, 4-й этаж паркинга, каб. 28, тел.: 8 (017) 298-53-53; (8029) 690 54 09, **BELTORGI.BY**

Продавец: **ОАО «Житковичлес»** (УНП 400049968), 247960, Гомельская обл., г. Житковичи, ул. К. Маркса, 80, в лице ликвидатора Лобко Александра Николаевича, тел. 8 (02353) 2-18-74.

Публичные торги в электронной форме будут проведены: **19 января 2021 г. 09.00–17.00** на электронной торговой площадке **BELTORGI.BY.**

| № п/п | Предмет торгов | Место-нахож-дение | Начальная цена предмета торгов, бел. руб. с НДС |
|---|---|---|---|
| 1 | Трактор трелевочный «Беларус» ТТР-401 М-05, гос. № ЕВ3-3908, 2010 г. в. | 1 | 20 000,00 |
| 2 | Трактор трелевочный ТТР-401 М-05, гос. № ЕВ3-4519, 2010 г. в. | 1 | 20 000,00 |
| 3 | Машина транспортно-погрузочная лесная МТПЛ 5-11, гос. № 6086 ЕК-3, 2018 г. в. | 1 | 35 000,00 |
| 4 | Трактор трелевочный «Беларус»-ТТР-401М-04 гос. № ЕВ3-3433, 2010 г. в. | 1 | 20 000,00 |
| 5 | Машина транспортно-погрузочная лесная МТПЛ 5-11, гос. № 6089 ЕК-3, 2010 г. в. | 1 | 35 000,00 |
| 6 | Трактор трелевочный ТТР-401М, гос. № ЕВ3 - 1469, двиг.№ 448169, 2009 г. в. | 1 | 20 000,00 |
| 7 | Машина транспортно-погрузочная лесная МТПЛ-5-11, гос. № ЕК-3 5443, 2018 г. в. | 1 | 35 000,00 |
| 8 | Трактор трелевочный ТТР-401 М-05, гос. № ЕВ3-4522, 2010 г. в. | 1 | 20 000,00 |
| 9 | Машина транспортно-погрузочная лесная МТПЛ 5-11, гос. № 5460-3 ЕК, 2010 г. в. | 1 | 35 000,00 |
| 10 | Трактор трелевочный «Беларус» ТТР-401 М-05, гос. № ЕВ3-3909, 2010 г. в. | 1 | 20 000,00 |
| 11 | Машина погрузочно-транспортная «Беларус» МПТ, гос. № ЕК3-7150, 2010 г. в. | 1 | 40 000,00 |
| 12 | Машина погрузочно-транспортная «Беларус» МПТ, гос. № ЕК3-7148, 2011 г. в. | 1 | 40 000,00 |
| 13 | Трактор трелевочный ТТР-401 М-05, гос. № ЕК 3-7131, 2010 г. в. | 1 | 20 000,00 |
| 14 | Машина транспортно-погрузочная лесная МТПЛ-5-11, гос. № 4548-3 ЕК, 2018 г. в. | 1 | 32 000,00 |
| 15 | Автомобиль МАЗ 6303-А8, гос. № АЕ 7919-3 с манипулятором гидравлическим М-75-04, 2010 г. в. | 1 | 40 000,00 |
| 16 | Прицеп МАЗ 837810 (022), гос. № А 4815 А-3, 2010 г. в. | 1 | 10 000,00 |
| 17 | Автомобиль МАЗ 6303-А8, гос. № АЕ 7921-3, с манипулятором гидравлическим М-75-04, 2010 г. в. | 1 | 40 000,00 |
| 18 | Прицеп МАЗ 837810 (022), гос. № А 4816 А-3, 2010 г. в. | 1 | 10 000,00 |
| 19 | Автомобиль ЗИЛ ММЗ554М, гос. № 0452-3 АМ, 1986 г. в. | 1 | 2 800,00 |
| 20 | МАЗ-5551 Самосвал, гос. № АВ 33-55-3, 1991 г. в. | 1 | 11 000,00 |
| 21 | Автомастерская ЗИЛ 131 ПРМ, гос. № АІ 3858-3, 1990 г. в. | 1 | 7 000,00 |
| 22 | Автомашина «УРАЛ» 4320-3, гос. № ЕМ 6265, 1996 г. в. (без постановки на учет) с гидроманипулятором ПЛ 70-02, 2002 г. в. | 1 | 16 000,00 |
| 23 | Автомобиль КРАЗ 260, гос. № АК 6780-3, 1998 г. в. с гидроманипулятором Атлант ЛВ 185-10 2004 г | 1 | 26 000,00 |
| 24 | Автомобиль УАЗ*390945*330 № двиг. 409100* В3044904, № шасси 330360В0459912, гос. № АІ 1144-3, 2010 г. в. | 1 | 9 000,00 |
| 25 | Автомобиль легковой HYUNDAI SANTAFE 2,4, гос. № 12 44 ЕР-3, 2012 г. в. | 1 | 40 000,00 |
| 26 | Легковой автомобиль «Фольксваген Пассат», гос. № 2054 ВС-3, 1998 г. в. | 1 | 9 000,00 |
| 27 | Полуприцеп УПП1212, 1993 г. в. (без постановки на учет) | 1 | 4 000,00 |
| 28 | Газ 53 Автоцистерна АЦ-4.2, гос. № АА 9628-3, 1983 г. в. | 1 | 18 000,00 |
| 29 | Автомобиль VOLKSWAGEN CARAVELLE, гос. № 6951АЕ3, 1989 г. в. | 1 | 1 000,00 |
| 30 | Автомобиль УАЗ-452, гос. № 7844-3 АО, 1980 г. в. | 1 | 6 000,00 |
| 31 | Автомобиль УАЗ 390995-460-04, гос. № 1663-3 АМ, двиг. № 409110*Н3036855, VIN: ХТТ 390995J202995, 2017 г. в. | 1 | 17 000,00 |
| 32 | Автомобиль УАЗ 390995-460-04, гос. № 0406-3 АМ, 2017 г. в. | 1 | 16 000,00 |
| 33 | Погрузчик фронтальный одноковшовый SHANTUI SL30 W, гос. № 4521 ЕК-3, 2013 г. в. | 1 | 35 000,00 |
| 34 | МАЗ-53336 (бортовая), гос. № АК 21-49, 1991 г. в. | 1 | 15 000,00 |
| 35 | Прицеп бортовой МАЗ 8926, гос. № 3785 АА, 1993 г. в. | 1 | 4 000,00 |
| 36 | Погрузчик УН-053, 1981 г. в. (без постановки на учет) | 1 | 4 000,00 |
| 37 | Автопогрузчик (львовский), 1990 г. в., инв. № 000260 | 2 | 7 000,00 |
| 38 | Трактор Т-130, 1992 г. в., инв. № 130 (без постановки на учет) | 1 | 10 000,00 |
| 39 | Грузовой бортовой ГАЗ-66-12, гос. № 4033-3 АМ, ш.0456045, дв.109082, 1986 г. в. | 1 | 11 000,00 |
| 40 | Автомобиль «Урал»-375, гос. № 0813-3 АМ, 1980 г. в., (без постановки на учет) | 1 | 9 500,00 |
| 41 | Грузовой спец. лесовоз «УРАЛ»-375А гос. № 0812-3 АМ, 1980 г. в. (без постановки на учет) | 1 | 13 000,00 |
| 42 | Прицеп ПЕА тракторный, 1991 г. в., инв. № 21 Т (без постановки на учет) | 2 | 400,00 |
| 43 | Прицеп ПЕА тракторный, 1991 г. в., инв. № 22 Т (без постановки на учет) | 2 | 400,00 |
| 44 | Прицеп ПЕА тракторный, 1992 г. в., 16 Т (без постановки на учет) | 2 | 300,00 |
| 45 | Станок комбинированный деревообрабатывающий ВБ-1М, инв. № 11 | 1 | 400,00 |
| 46 | Станок ленточнопильный КЛГ гравитон, инв. № 144 Т | 1 | 300,00 |
| 47 | Станок д/о ДКП-150 /горбыльный/, инв. № 158 | 2 | 1 200,00 |
| 48 | Брусующий станок TS 52-2R, инв. № 231 | 2 | 15 000,00 |
| 49 | Торцующий станок SPS 12-3R, инв. № 232 | 2 | 9 000,00 |
| 50 | Многопильный станок DS-55-IR, инв. № 233 | 2 | 18 000,00 |
| 51 | Вентилятор ВЦП6-45 № 8 с дв. 30/1500 люб. вращения ХВ, инв. № 238 | 2 | 3 000,00 |
| 52 | Станок д/о торцовочный ЦТ 15-5, инв. № 239 | 1 | 1 500,00 |
| 53 | Ленточнопильный станок МГ 6200, инв. № 294 | 1 | 1 500,00 |
| 54 | Вентилятор ВЦП6-45 № 8 без электродвигателя ХВ, инв. № 318 | 2 | 300,00 |
| 55 | Станок для переработки горбыля, инв. № 325 | 2 | 1 200,00 |
| 56 | Пилорама РПМ -02-К б/у, инв. № 397 | 2 | 7 000,00 |
| 57 | Станок строгальный 4-сторон., инв. № 45 Т | 2 | 10 000,00 |
| 58 | Станок Ц-6-2, инв. № 54 Т | 2 | 1 200,00 |
| 59 | Станок ШЛД-6, инв. № 56 Т | 2 | 2 000,00 |
| 60 | Станок Ц-6, инв. № 60 Т | 2 | 1 200,00 |
| 61 | Станок ГТП-5-2, инв. № 61 Т | 2 | 1 400,00 |
| 62 | Многопильный станок Mebor VC 700 ind75, инв. № 22298 | 1 | 27 000,00 |
| 63 | Станок многопильный деревообрабатывающий ЦМР-3 с рольгангами не приводными 3.000 (2 шт.), инв. № 563 | 2 | 8 000,00 |
| 64 | Лесопильная рама ЛРВ-1 № 6951, инв. № 514 | 2 | 9 500,00 |
| 65 | Станок заточной для дисковых пил СЗТП 600 Т, инв. № 481 | 2 | 1 000,00 |
| 66 | Лесотранспортер ДТ-1 92, инв. № 001265 | 2 | 2 800,00 |
| 67 | Станок многопильный деревообрабатывающий МН-9-1736-002 с рольгангами не приводными 2.000 (2 шт) | 1 | 2 500,00 |
| 68 | Станок многопильный поперечнопильный MAS | 1 | 9 600,00 |
| 69 | Станок брусовочный двухвальный | 1 | 20 000,00 |
| 70 | Вентилятор ВЦП 7-40 № 8 без эл. дв., инв. № 565 | 2 | 2 000,00 |
| 71 | Электропила ЭПЧ-3 (без зипа), инв. № 254 | 2 | 100,00 |
| 72 | Бензопила MS-361 172157-104, инв. № 350 | 1 | 200,00 |
| 73 | Бензопила MS-361 172157-131, инв. № 352 | 2 | 400,00 |
| 74 | Бензопила MS361 174656398, инв. № 377 | 2 | 450,00 |
| 75 | Бензопила MS361 № 184999459, инв. № 570 | 1 | 500,00 |
| 76 | Бензопила MS361 № 184999564, инв. № 571 | 1 | 700,00 |
| 77 | Перфоратор MAKITA HR 4501 C в чем., инв. № 587 | 1 | 1 200,00 |
| 78 | Бензопила «Штиль 362» (Цепь, шина) № 179524241, инв. № 475 | 1 | 600,00 |
| 79 | Бензопила MS361 № 182712442, инв. № 505 | 1 | 700,00 |
| 80 | Бензопила MS361 № 182751576, инв. № 506 | 1 | 400,00 |
| 81 | Бензопила MS361 № 183177620, инв. № 508 | 1 | 700,00 |
| 82 | Бензопила MS361 № 183177621, инв. № 513 | 1 | 700,00 |
| 83 | Бензопила MS361 № 183197862, инв. № 519 | 1 | 700,00 |
| 84 | Бензопила MS361 № 183864091, инв. № 540 | 2 | 700,00 |
| 85 | Кусторез FS 460 C-EM (с ножом для молодняка), инв. № 483 | 1 | 1 500,00 |
| 86 | STIHL Бензокоса FS300, инв. № 253 | 2 | 600,00 |
| 87 | Молот пневматический, инв. № 000885 | 1 | 4 500,00 |
| 88 | Станок ЛВ-116А, инв. № 001309 | 2 | 100,00 |
| 89 | Станок сверлильный 2Н 135, инв. № 001310 | 1 | 2 100,00 |
| 90 | Станок вертикально-фрезерный, инв. № 001311 | 1 | 4 000,00 |
| 91 | Станок токарный Д-95, инв. № 001314 | 1 | 1 500,00 |
| 92 | Станок ЛВ-116А, инв. № 001322 | 1 | 100,00 |
| 93 | Мотопомпа, инв. № 001427 | 1 | 2 500,00 |
| 94 | Фильтр ФРМД 4000 м³, инв. № 111 | 2 | 400,00 |
| 95 | Устройство для заточки ленточных пил, инв. № 251 | 2 | 100,00 |
| 96 | Тележка гидравлическая, инв. № 252 | 2 | 300,00 |
| 97 | Гидроманипулятор ОМТЛ-97, инв. № 262 | 1 | 6 000,00 |
| 98 | Станок заточной МГ25/50С3 и приспособление разводное МГ 6200, инв. № 295 | 1 | 200,00 |
| 99 | Токарно-винторезный станок, инв. № 30 Тур | 2 | 2 500,00 |
| 100 | Станок мод. В3-367 точильно-шлифовальный, металлореж., инв. № 36 | 1 | 600,00 |
| 101 | Аппарат высокого давления 175TST (мойка), инв. № 360 | 1 | 150,00 |
| 102 | Манипулятор ОМТЛ 97 (УРАЛ 9627), инв. № 389 | 1 | 8 000,00 |
| 103 | Станок сверлильный, инв. № 57 Т | 2 | 400,00 |
| 104 | Станок заточной, инв. № 59 Т | 2 | 200,00 |
| 105 | Пресс гидравлический Б/У, инв. № 64 | 1 | 500,00 |
| 106 | Заточной станок Б/У, инв. № 68 | 1 | 200,00 |
| 107 | Преобразователь ПЧ-20М, инв. № 001335 | 2 | 100,00 |
| 108 | Компрессор 11/В50 СМ | 1 | 320,00 |
| 109 | Навесное оборудование щетка дорожная НО-86 заказ 1щд-3, инв. № 390 | 1 | 700,00 |
| 110 | Пост для ремонта легковых автомобилей, инв. № 001666 | 1 | 2 500,00 |
| 111 | Кондиционер GREE GWH12NA-K3NNB3A/1, инв. № 486 | 1 | 700,00 |
| 112 | Кондиционер GREE GWH07AAA-K3NNA2A, инв. № 503 | 1 | 600,00 |
| 113 | Кондиционер GREE GWH12AAB-K3NNB2A, инв. № 504 | 1 | 700,00 |
| 114 | Кондиционер GREE GWH12NA-K3NNB3A/2, инв. № 487 | 1 | 700,00 |
| 115 | Кондиционер GREE GWH07NA-K3NNB3A, инв. № 488 | 1 | 600,00 |

**Местонахождение:**
**1 – Гомельская обл., г. Житковичи, ул. Комсомольская, 45а,**
**2 – Гомельская обл., Житковичский р-н, п. Хвоенск,**
**тел. для ознакомления и осмотра +37529 698-53-18.**

**Для участия в торгах необходимо в срок** с 19.12.2020 г. 09.00 по 18.01.2021 г. 17.00: 1) зарегистрироваться и подать заявку по выбранному лоту на участие в торгах на сайте BELTORGI.BY; 2) перечислить задаток по выбранному лоту на р/с BY33BPSB30121854590139330000 в ОАО «БПС-Сбербанк», код BPSBBY2X, УНП 191113330, получатель – ЗАО «Белреализация».

Шаг торгов – 5 %, задаток – 10 % от начальной цены предмета торгов. Организатор торгов вправе отказаться от их проведения не позднее, чем за день до наступления даты проведения торгов. Торги проводятся при наличии не менее двух допущенных к участию в них участников. Победителем торгов признается лицо, предложившее наиболее высокую цену. Если заявка на участие в торгах подана только одним участником, торги признаются несостоявшимися. Предмет торгов продается претенденту на покупку при его согласии по начальной цене, увеличенной на пять процентов. Результаты торгов оформляются в виде протокола. Победитель торгов (претендент на покупку) обязан в течение 5 рабочих дней со дня проведения торгов оплатить сумму фактических затрат, связанных с организацией и проведением торгов, аукционный сбор. Срок заключения договора купли-продажи и оплаты предмета торгов – 10 рабочих дней со дня проведения торгов.

# Могилевский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки» информирует о проведении 21.01.2021 г. аукциона по продаже имущества ЗАО Банк ВТБ (Беларусь)

**Лот № 1: Капитальное строение с инв. № 732/С-5785 – склад-навес,** общ. пл. 2867 кв. м, расположенное по адресу: Могилевская обл., Костюковичский р-н, г. Костюковичи, участок № 1, на земельном участке с кадастровым номером: 723550100001000502 (право аренды, площадь – 1,5323 га). Отдельный земельный участок для обслуживания лота № 1 не выделен. ***Начальная цена продажи: 179 000,00 бел. руб. с учетом НДС.***

**Лот № 2: Капитальное строение с инв. №732/С-5787 – арматурный цех,** общ. пл. 1711 кв. м, расположенное по адресу: Могилевская обл., Костюковичский р-н, г. Костюковичи, участок № 2, на земельном участке с кадастровым номером: 723550100001000503 (право аренды, площадь – 0,3913 га). ***Начальная цена продажи: 125 000,00 бел. руб. с учетом НДС.***

**Аукцион состоится 21 января 2021 года в 12.00 по адресу: г. Могилев, ул. Первомайская, 77, к. 352.**

Извещение о проведении аукциона размещено на сайте Организатора аукциона **ino.by.**

Организатор аукциона: **Могилевский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки»,** УНП 190055182, г. Могилев, ул. Первомайская, 77, к. 352, Mogilev@ino.by.

Доп. информацию можно получить по тел.: **+375222-72-41-14, +37529-624-26-25, +37529-550-09-56** и на сайте **ino.by**

# КВЕТКІ МАРЫІ

## Пісьменніца Марыя ВАЙЦЯШОНАК нарадзілася ў высылцы на Алтаі, вырошчвае касмеі і слухае рэпераў

*...Адчыняюцца дзверы*
*Ў хаце,*
*Трэба сказаць*
*Гаспадыні,*
*Па што я*
*Прыйшла.*
*Па дарагія ўспаміны,*
*Быццам еду*
*З сёстрамі*
*З млына*
*на конях*
*Напудраваўшыся вальцам,*
*І кветка ў валасах.*
*«Асадніцкія дзеўкі»...*

Гучаць — ліюцца замовай радкі верша са зборніка Марыі Вайцяшонак «Альбом для цёткі Марылі». Аб'ёмісты том, у якім проза, вершы, згадкі, мудрасць, настальгія, прыгажосць, шмат сэнсаў і падтэкстаў.

Вось сабралася згадаць, што ў Марыі Антонаўны 80-гадовы юбілей — і таксама падтэкст... Бо яна сама магла не ведаць пра гэтую дату.

«Асадніцкая дзеўка», дачка польскага асадніка, яна нарадзілася на далёкім Алтаі, у Змяінагорску, куды ў 1940-м саслалі сям'ю. Маці, беларуская сялянка, у час высылкі была цяжарная. Таму Марыя і не ведала ні свайго дакладнага дня нараджэння, ні нават года. Запісалі ўзрост пасля, прыблізна... І толькі нядаўна Марыя Вайцяшонак даведалася з дакументаў, што нарадзілася 1 снежня 1940 года.

Першае жытло яе — зямлянка, у якой змушаны былі туліцца разам з козамі. Бацька там, у высылцы, хутка завёў іншую сям'ю. А «асадніцкім дзеўкам» давялося выжываць...

Але не, і гэта няправільнае слова. Марыя заўсёды жыла — так, як іншым не дадзена, не ўмеюць. Там, дзе іншыя б зламаліся, ачарсцвелі душой, яна праходзіла з кветкай у валасах, з уменнем бачыць прыгажосць, прабачаць і спачуваць...

Марыя напісала дзясяткі кніг — прозы, публіцыстыкі, паэзіі, працавала ў часопісах «Беларусь» і «Нёман», у «Сельской газеце». І заўсёды ўспрымалася для мяне ў атачэнні кветак... І ў дзівосным садзе, які гадуе на лецішчы... І ў доме, у густоўным стракацценні карцін, букетаў, каменняў і ракавінак... І ў яе вершах — кветкі, кветкі... Лілея ў пакрышаным бурай садзе, напёрстка на пахавальным пагорку, таямнічая алтайская брунера, юлёвая ясная кампанула, познія дзікія юргіні, белыя канвалії...

Сёння Марыя жыве за горадам, каля свайго саду. У яе сур'ёзныя праблемы са зрокам — свае думкі яна надыктоўвае, і з дапамогай гісторыка Аксаны Ёркінай яны трапляюць на адмысловую старонку ў фэйсбуку «На прызбе ў Сілічах», дзе кожны можа сустрэцца з Марыяй, пачуць яе.

І гэтая наша размова — быццам шлях праз яе Сад.

### МАР'ІН КОРАНЬ

***— Памятаеш сваю першую сустрэчу з кветкамі?***

— Так... На Алтаі... Памятаю сопкі, горы... Я не ўсведамляла, што мы былі сасланыя, што быў голад, што было вельмі холадна. Таму што ў мяне мелася воля. Я хадзіла сама па сопках, ніхто мяне не чакаў: ні старэйшая сястра, ні мама. Бацька ўжо з намі не жыў. І самы дарагі твар, першы, які ўспамінаю, — твар прыроды. Нам дазволілі пераехаць у горад, у Змяінагорск, пасля рэабілітацыі, там ужо жылі ў падвале. А калі ў зямлянцы, дарослыя мяне пакідалі зусім маленькую і ішлі працаваць на руднік. Першы ўспамін: прыйшла вясна, столь зямлянкі пачала працякаць, на падлозе стаяла лужына. І раптам бачу, што кавалак гліны, які зваліўся са столі, пачаў рухацца — гэта была жаба... Самае цікавае — не ўспамінаю адчування голаду. Я ж магла карыстацца ўсім, што ў мяне пад нагамі: лісце, трава... Не было прадчування бяды. Здавалася, вось яно, жыццё, такім і павінна быць. Жук, які жыве недзе ў зямлі, пэўна ж, не маркоціцца, не сумуе, не лічыць сябе няшчасным, што ў яго такое асяроддзе. Выходзіш з падвала і бачыш такі прыгожы свет... Дык вось, памятаю, як я знайшла паўзучую півоню — мар'ін корань. І гэта была такая падзея, што гэтая кветка мне сустрэлася. Яна не бухматая, але пялёсткі вялікія, яркі колер, пурпуровы. Я адчула асабовасць кветкі і сябе таксама. Нехта мяне вылучыў нарэшце! Па сёння памятаю схіл той сопкі...

***— Колькі гадоў табе было?***

— Ну, можа, пяць. Па сёння шукаю — на кірмашах, Камароўцы мінскай — той мар'ін корань. Купляю насенне, мне нешта прыносяць, але гэта не той мар'ін корань дзікі... Падобны, але ён ужо бухматы, некім адкарэкціраваны... У тыя гады на ўсе вочы мае была тая кветка... Здавалася, гэта не расліна, а разумная істота.



### КАСМЕЯ

***— У тваіх вершах часта згадваецца касмея...***

— На Алтаі мы жылі толькі за тое, што мама магла прасці, у падвале нашым стаяў калаўрот, а старэйшая сястра Уладзя на пруткох вязала хусткі раблёныя, белыя, з казінага пуху. У падвале з намі жылі козы. Мы з сястрой неяк адносілі заказ да жанчыны... А яна кажа: «Я зараз вам нарэжу кветак». Гэта былі касмеі. Яны стаялі вельмі густа. Цэлая дзялка... І ў мяне з'явілася жыватворчае адчуванне... Таму што нам часам давалі ў дадатак да аплаты нейкія прадукты, рэчы, а кветкі ніхто ніколі не прапаноўваў. Гэта першы раз. Нам было вельмі важна, што ў нас, худых, галодных, кепска апранутых, пабачылі тых, каму можна падарыць кветкі. Можа, таму, што Уладзя вязала вельмі прыгожыя хусткі. І святла ж не было ў падвале, але атрымлівалася ў яе мастацтва... У мяне ёсць нават нейкі фотаздымкаў, дзе Уладзя ў такую хустку захутаная, хустка вялікая, хавае ўсю постаць.

***— У цябе яшчэ былі сёстры, браты?***

— Уладзя была сасланая з бацькам і маці ў Змяінагорск. А малодшыя, Гелена, Лёня, як яе звалі па-хатняму, і брат Бронік, памерлі яшчэ ў аблозе, пахаваныя ў Паставах, на гарадскіх могілках. А мама на Алтаі памерла, і бацька. Але яго ўжо хавала іншая сям'я. Дарэчы, цяпер у мяне раскоша...Тут, у Сілічах, доўжыцца мой Алтай, бо козы нашага суседа ідуць на выган каля маіх вокнаў... Тады клічу свайго сабаку: «Мальта, паглядзі: козлікі ідуць!»

### БЕЛАЯ РУЖАЧКА

***— Чаму твой зборнік называецца «Альбом для цёткі Марылі»?***

— Пасля смерці маці я была ў дзіцячых дамах, у Змяінагорску, потым у Маскве, у Залессі, потым у Ракаве. Уладзя вельмі хутка памерла, сэрца не вытрымала. Яна ўжо на рудніках была хворая. А галоўнае — знайшла мяне цётка Марыля. Я была ў яе з другога па сёмы клас і з дзіцячых дамоў на канікулы прыязджала. Яна з мужам Віталікам жыла ў Грыдзьках, на Пастаўшчыне. Гэта радзіма мамы, мая радзіма. Ад Грыдзек, за кіламетр, не болей, была аблога бацькава. Хата цёткі і дзядзькі маленькая, з адным акенцам — будавалася пасля вайны як варыўня. Дзядзька і цётка тады думалі, што пасля яшчэ пабудуюць хату, але так і не разжыліся — з гэтай варыўні і пайшлі ў іншы свет. Я ніколі не чула, каб мае дзядзька і цётка гаварылі, што яны бедныя. Падлога была земляная, страха саламяная... І ніхто ніколі не жаліўся. Не бедавалі, не зайздросцілі, ні пра кога не гаварылі кепска. Для мяне яны — святое сямейства. А пад акном у нас расла белая ружачка. І, пэўна, мой дзядзька Віталік заўважыў, што ў мяне да гэтых кветак асаблівае стаўленне. Ён прыходзіць дамоў і трымае руку за спінай. І раптам падносіць мне ружу... Але не белую, а ружовую, таксама не садовую, а з куста. «Глядзі, кажа, у Вінцука якая ружа ёсць!» І гэта была першая кветка, якую мне падарыў мужчына — мой дзядзька. А быў ён «вараўны», як у нас казалі, не любіў размаўляць...

***— Гэтая твая фраза — «Прысела і думаю, ці не доўга я сяджу» — адтуль, ад сялянскага ўкладу цёткі?***

— Так. Я лічу, што воля і свавола ходзяць, за рукі пабраўшыся. Я прывыкла шанаваць час. Вельмі важна, каб у дзіцяці была свая адказнасць. Мне дзядзька Віталік мог сказаць: «Вось гэта зробіш, а потым куды хочаш, туды ідзі». Гэта такі заробак, ты зарабляеш сабе волю. А калі твая воля зробленая, у яе зусім інакшы колер. І вакол цябе тады ўсё такое каляровае, бухматае, шыкоўнае. Ты ўжо напоўзаўся ў лехах, нешта выбіраў, палоў... І раптам — воля. Дзеці павінны, як у жмені, разам быць усё жыццё са старэйшымі. Я дзіўлюся, калі наша суседка, маладая мама, прыводзіць сваю дачку ў капялюшыку з карункамі, і штонікі на ёй таксама як на даваенных святочных паштоўках. А побач жа зямля дыхае, вяскоўцам ні прысесці, ні ўстаць, ні пагуляць... Мне ў вёсцы ўдзень пераапранучца ў нешта лепшае няма як. І вось гляджу я на тую маладую маму і дачку ў капялюшыку і дзіўлюся: на якое жыццё яны разлічваюць? Лепш пачынаць з зямлі, падымацца ад яе. Вучыць дзіця садзіць цыбулінку, зярнятка. Не цурацца тае зямлі, не адгароджвацца ад яе нейкімі ўборамі, сукенкамі. Трэба дыхаць гэтай зямлёй. Тады ў дзіцяці будзе «зазямлене», яно «магнэз зямлі» стане адчуваць. Мы яшчэ так мала спасціглі таго, што ў нас пад нагамі. Толькі жывучы ў вёсцы, можаш мець нейкія здаровыя адчуванні, рэакцыю на тое, што адбываецца.

### КАТАЛЬПА

***— У тваім садзе ёсць любімыя кветкі?***

— Я дзіўлюся, калі гавораць: зараз модная вось такая кветка ці вось такая... Не разумею гэтага, таму што сад павінен мець гісторыю гаспадара, люстраваць яго адносіны да зямлі. Каб было адзінства з ім. Напрыклад, калі мы набылі гэты дом, у садзе расло вялікае дрэва катальпа, яно родам з Японіі, Кітая. Былы гаспадар непакоіўся, ці будуць на ім лісты вясной, прапаноўваў спілаваць. Я пачала дрэва выходжваць... І гэтым летам здарыўся вялікі вецер. Я паглядзела ў акно і ўбачыла, што за ноч вецер змяніў катальпу. Расахатае галлё стала інакшым, а само дрэва разварнулася тварам да сцежкі, па якой звычайна мы ходзім. Да нас. І гэта было так нечакана... Як быццам які чалавек раптам сказаў табе нешта добрае. І цяпер ідзеш паўз тое дрэва — абавязкова звяртаеш увагу на яго. І гэтым летам яно цвіло... Ярусамі, вялікімі белымі кветкамі... Ёсць у мяне яшчэ кветка, якая родам з Алтая, саранка. Яна абавязкова павінна быць у мяне, яна для мяне як радня. Гэта такая лілея... Яе карэнні можна нават есці. Не памятаю, магчыма, у дзяцінстве і каштавала яе.

### КВЕЦЕНЬ БУЛЬБЫ І САКУРЫ

*Жанчыны*
*Майго племя*
*Не ходзяць глядзець*
*На сакуру*
*На вішню*
*Ў ружовым.*
*Яны перапытваюць*
*Адна ў адной,*
*Ці зацвіла ў гародзе*
*Бульба.*
*Дробная кветка без паху,*
*Не маючы прыгажосці,*
*Толькі сваім з'яўленнем*
*Вабіць увагу,*
*Абяцае*
*Ружовую завязь паспешкі.*

